Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 52 (2850) Год LV | Беласток, 26 снежня 2010 г. | Цана 3,00 зл. (VAT 0%)

У Падляшскім музеі зазіхацела ад каляровых калядных гвяздаў і выцінанак. Ад чацвярга 16 снежня да канца лютага 2011 г. можна пабачыць зборы першага конкурсу на Калядную гвязду, аздобленую выцінанкамі. Конкурс працягваўся ад лістапада да снежня 2010 года, але прадстаўнікі арганізатараў (аддзела этнаграфіі Падляшскага музея і фонду „Цэпэлія — польскае мастацтва і рукадзелле" Ежы Цэтэра і Войцех Кавальчук больш года папаўнялі зборы, расшуквалі жывых прадаўжальнікаў традыцыі і самі распаўсюджвалі яе, заахвочваючы малодшае пакаленне. Ідэя была працягам праекта „Падляшская выцінанка. Папера ў народнай культуры", арганізаванага ў рамках праграмы „Нацыянальная спадчына".

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Колеры падляшскіх Каляд

— Гэта пакуль пілатажны конкурс, — кажа Ежы Цэтэра. — Спадзяемся, што праз год прац будзе значна больш. Вядома, гвязды мусяць быць выкананы згодна з нацыянальнай традыцыяй, без пенапластаў, парчы. Хочам распаўсюдзіць мясцовую традыцыю вырабу калядных гвяздаў, здобленых выцінанкамі, сягаючай канца XIX стагоддзя. Малавядомую ў Польшчы падляшскую выцінанку можна ўбачыць на вёсках толькі на праваслаўных калядных зорках. Найстарэйшыя прыклады выцінанак на выставе можна ўбачыць у зборах кракаўскага Этнаграфічнага музея — з Буд пад Белавежай і Старасельцаў пад Беластокам (пачатак XX стагоддзя).

Не пераломе XIX і XX стст. аздобамі, выцінанымі з паперы, аздабляўся інтэр'ер вясковых хат. Яшчэ ў пяцідзесятыя гады папулярныя былі заслоны, выцінаныя з паперы. Вырэзваліся нажом ажурныя колцы, зорачкі, дарожкі і стылізаваныя кветкі, наклейваліся на папяровыя лісты. Размешчваліся яны на сценах паміж абразамі, на вокнах, на рамах ікон. Найвыдатным вядомым выцінанкаром быў ураджэнец Макаўкі Сіман Чарнякевіч. У ваколіцах Нарвы, Гайнаўкі і Бельска вялікай выцінанкай у коле, званай месяцам, вянком або груддзю аздаблялі ліцо гвязды, а дробнымі круглымі і квадратнымі выцінанкамі — яе плечы і спіну. Пасля II сусветнай вайны месяц сталі замяняць крыжамі, шматкаляровымі неажурнымі зоркамі і фігуркамі звяроў. У момант запаўнення ліца шклом перасталі фронт гвязды адзабляць выцінанкамі — замянілі іх абразкамі і фігуркамі звязанымі з Раждяствам. Выцінанкі рабілі перш за ўсё хлопцы і мужчыны.

— Яшчэ да нядаўна ўсе ведалі, што каляровую паперу трэба скласці на шэсць ці восем частак, каб пры дапамозе нажніц выразаць геаметрычны ці фігурны арнамент, па ўзору старадаўніх гвяздаў, — успамінае Войцех Кавальчук. — Ездзілі мы па вёсках у пошуках спецыялістаў па вырабе гвяздаў, вазілі з сабою каляровую паперу, і навочна пераконваліся, што традыцыя ўсё жывая. Цікавіліся, ці працягваецца традыцыя і вырабу фіранак з белай паперы пры дапамозе нажа, нажніц ці долаткаў. Асаблівы тып выцінанак стваралі божнічкі — заслонкі аздабляючыя іконы ў святых кутах. Рабіліся яны ў спецыялістаў м.інш. у Макаўцы, Сацах, Васьках ці Крывой, прадаваліся на рынках у Бельску, Гайнаўцы, Нарве, па 3-5 злотых. Мода на выцінанкі-фіранкі стала знікаць ад канца 60-х гадоў XX стагоддзя.

Журы кваліфікавала да конкурсу 74 працы дзесяці аўтараў (адна гвязда не была ўлічана таму, што была выканана 17 гадоў таму і была закуплена ўласнікам заяўленай працы). У катэгорыі калядных гвяздаў, аздобленых выцінанкай, першую ўзнагароду атрымаў Пётр Багацэвіч з Крывятыч за калядную гвязду трохрадку з лямпіёнамі, другую — Фёдар Марціновіч з Бельска-Падляшскага за калядную гвязду з выцінанкай, трэцюю — Ян Сыльвэструк з Гародчына за калядную гвязду з ліцом аздобленым выцінанкай. У катэгорыі камплектаў выцінанак для аздаблення гвяздаў: I месца — Эмілія Багацэвіч і Павел Багацэвіч з сеніёрам Пятром Багацэвічам з Крывятыч за камплект выцінанак на ліца гвяздаў, II месца — Мікалай Ліпскі з сеніёрам Уладзімірам Ліпскім з Плёсак за камплект выцінанак на ліца і плечы гвяздаў, III месца — Кацярына Семянюк і Ян Сыльвэструк з Гародчына за тры камплекты выцінанак на ліца і плечы гвяздаў, Уладзімір Касцючук з Тыневіч-Вялікіх за камплект выцінанак, адзабляючых плечы гвяздаў. У катэгорыі апісанняў і здымкаў старых гвяздаў, апісання калядных традыцый I узнагарода дасталася Якубу Багацэвічу з Крывятыч за камплект старадаўніх выцінанак, аздабляючых ліца калядных гвяздаў.

Сярод збораў на выставе — арыгіналы і рэканструкцыі выцінанак з міжваеннага перыяду, выкананыя ў 1959 г. Сіманам і Марфай Чарнякевічамі з Макаўкі, выцінанкі з вёскі Лукі (выкананыя ў 1955 г.), ікона Мікалая Цудатворца з 50-х гадоў XX ст., выцінанка для дэкарыцыі сцен з 1955 г., выкананая Людвікам Тудалем з вёскі Банькі, выцінанкі з Плянты Нараўчанскай гміны, з Вышак, Філіпаў, выцінанкі Анны Сахарчук з 1955 г. з Крывой, Марыі Ваўранюк з Макаўкі, божнічак з Паўлаў, выцінанкі для рам з Макаўкі, Крывой, паказаны святы кут у Семяноўцы (здымак з 1982 г.), заслонкі на іконы Еўдакіі Маркевіч з Дашоў Кляшчэлеўскай гміны (выкананыя ў 2009 г.), выцінанкі з Кнарыд, Васькоў, Тыневіч-Малых. Імёны майстроў — Эдуард Матчук, Сяргей Снарскі, Вольга Панасюк, Зофія Дудзіч, Эдвард Нестарук, Марыя і Вольга Ваўранюк, Аляксандра Чарнякевіч, Тарэса Фалькоўская, Ева Будзіловіч, Лявон Федарук з Рыбакоў. Сярод майстроў аздаблення гвяздаў — Сіман Чарнякевіч з Макаўкі, Ян Рыбак, Сяргей Куна і Васіль Казлоўскі з Міклашоў Арлянскай гміны, Юзаф Вішнеўскі з Тэрэмісак, Пётр Грыгарчук з Валіл, Павел Грыгарчук з Трасцянкі, Пятро Сэльвэсюк з Мора, Арсень і Ян Харкевічы і Міхал Стоцкі з Лукі, Павел Кудэрскі, Расціслаў Грыгарук і Юры Грыгарук з Галадоў Бельскай гміны, Андрэй Шварц з Чыжыкаў Гайнаўскай гміны, Васіль Станько з Ласінкі, Анатоль Краўчук з Крывой, Крыстына Арціхоўская з Сямятыч, Уладзімір Сахарчук з Локніцы. Гвязды з Трасцянкі, Буд, Тэрэмісак, Падалян, Кошак, Пасынак, Зуброў, Белай, Арагоднікаў, Плютыч, Ласінкі, Валіл, Плёсак — ад роду Ліпскіх, з ваколіц Бельска, гвязды роду Багацэвічаў з Крывятыч, выканыя і сучасна — перш за ўсё сеніёра Якуба Багацэвіча. Узоры на ліцо з выцятым крыжам, жывой зоркай, даакольныя...

Зоркі Якуба Багацэвіча (нар. у 1934 г.) можам знайсці ў Этнаграфічным музеі ў Варшаве, Беларускім музеі ў Гайнаўцы, у Маскве... Расказваў: „Калісь рабіў бубен з рэшата, цяпер вырэзваю паясы з двух-трохміліметровай фанеры. Палачкі на рагі — з яловага дрэва. У бубне прасвідроўваю дзіркі, раблю дзверцы, закладваю кабель асвятлення, бо ж цяпер не свечка гарыць у бубне. Раблю каляровыя вяночкі, зубаткі — з паперы. Рагі ўвенчваю кутасамі з каляровай паперы, на ліцо кладу таксама выцінанкі, часам наклейваю іконку з Раждяствам. Зрабіў я пару соцень гвяздаў... Прыгожая работа, прыносіць радасць і мне, і людзям".

9 770546 196000

Ніякіх выбараў. Пацыфікацыя

Уладзімір Някляеў быў збіты да непрытомнасці людзьмі ў чорным. Пацярпелі таксама людзі з яго каманды і журналісты

Ганьба і сорам для ўлады і яе служак за жахлівы калядны і навагодні падарунак беларускаму народу, здзейснены імі 19 снежня ў дзень праваслаўнага свята Міколы. Кандыдаты ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь рэпрэсаваны. Уладзімір Някляеў — жорстка збіты, непрытомны, з мазгавой траўмай трапіў у шпіталь, дзе яго арыштавалі і вывезлі ў невядомым напрамку. Андрэй Саннікаў — жорстка збіты на плошчы і арыштаваны ў шпіталі. Пабіты Віталь Рымашэўскі — арыштаваны на сходах шпіталя. Пабіты і арыштаваны Рыгор Кастусёў. Арыштаваны Мікола Статкевіч, Алесь Міхалевіч. Дзмітры Ус таксама арыштаваны. Разам з імі пабітыя і арыштаваныя сотні людзей, для якіх Беларусь ёсць і будзе гонарам і годнасцю. Аднак такія словы як гонар і годнасць пустыя і чужыя не толькі для Аляксандра Рыгоравіча, але і для ўсёй сістэмы ўлады. І не толькі для тых, хто жорстка збіваў, але і для тых, хто фальшаваў тое, што быццам мела называцца выбарамі, пачаўшы ад малых вясковых участкаў, а закончыўшы на выбарчых пунктах у дыпламатычных прадстаўніцтвах дзяржавы па-за яе межамі. І ступень адказнасці за зробленае зло падтасоўкі выбарчых вынікаў аднолькавы і ў неадукаванага старшыні сельсавета і ў адукаванага дыпламата. Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка прайграў. Ён прайграў да канца права называць сябе прэзідэнтам Беларусі. Прэзідэнт, які шануе свой народ, не дае загадаў зверска збіваць нявінных людзей. Прэзідэнт нармальнай краіны не мае права праследаваць сваіх палітычных канкурэнтаў, саджаць іх у турму, прымушаць да эміграцыі ці пастаянна абражаць у любы момант. Так, можна кіраваць краінай па-дыктатарску, але не ад імя беларускага народа. Перад намі судовыя прыгаворы, чалавечыя і нацыянальная трагедыі. Перад намі сумныя калядныя і навагоднія святы ў Беларусі.

Завяршаецца стагоддзе з дня нараджэння Ларысы Геніюш, якая была і далей застаецца зненавіджанай уладамі толькі за тое, што перамагла страх перад сістэмай. 19 снежня 2010 г. на вуліцах Мінска чарговыя пакаленні беларусаў даказалі, што яны ў змозе адкінуць страх і гатовы імкнуцца быць гаспадарамі на сваёй зямлі. Перад усімі Вамі мой нізкі паклон. А нам, беларусам Беласточчыны, звычайна, па-чалавечы, у час так прыгожых Каляд нельга забыцца пра лёс тых людзей, для якіх Бацькаўшчына гэта не пустое слова.

Яўген ВАПА

20.12.2010 г., 3.35 раніцы

Няпросты 2010-ты

(1)

Канчаецца дзве тысячы дзесяты год. Час азірнуцца назад, прыглянуцца дакладна яшчэ раз і ацаніць, якім жа ён быў кожнаму з нас, нашай дзяржаве і ўсёй нашай планеце Зямлі ў гэтым годзе. Што адразу трэба зазначыць тут, што для кожнага з нас ён выпаў канешне па-рознаму — ад няўдачнага праз удачны і вельмі ўдачны. Якая з гэтых груп была колькасна найбольшай, сказаць, канешне, цяжка. Падобна і ў сусветным людскім маштабе правесці такі падлік проста немагчыма. А вось пра сусветныя прыродныя катаклізмы можна з упэўненасцю сказаць, што іх напэўна пабольшала, часцей паяўляцца сталі і аказаліся яны больш магутнымі, злымі, проста лютымі. Тут і магутныя землетрасенні, ліўні-навадненні, пажары. Паўсюдна разгульваць сталі тарнада-смерчы, балотам горы расплывацца...

Не менш дакучлівымі і небяспечнымі з'яўляюцца і грамадскія катаклізмы. І іх чамусьці не меншае. Яны могуць быць і міждзяржаўнымі, і міжнацыянальнымі, і міжканфесійнымі, і мноства іншых „і". Грамадскія канфлікты часта перарастаюць у адкрытыя войны, што заўсёды з'яўляецца велізарным няшчасцем. Вялікі страх і няшчасці нясуць з сабой таксама модныя цяпер тэрарыстычныя акты. Былі яны, канешне, і калісьці, але даволі рэдкімі і не такой знішчальнай сілы. Накіраваны яны былі ў асноўным на забойствы высокапастаўленых чыноўнікаў ці сваіх палітычных праціўнікаў. Цяперашнія ж — на як найбольшае знішчэнне зусім нявінных людзей і іх маёмасці. А гэта, што не гавары, бруднейшай вады д'ябальскіх рук работа. Але арганізатары і выканаўцы іх, відаць, спяць спакойна і, выспаўшыся, рыхтуюць новыя. І ўжо ўсім незразумелым з'яўляецца тое, што гэтай чартоўскай зброяй шырока карыстаюцца рознай масці рэлігійныя экстрэмісты, напрыклад, ісламскія. У сваіх жа пачатках іслам быў талерантнай рэлігіяй. Сам Магамет лічыў, што і яўрэям, і хрысціянам праўды былі таксама аб'яўлены, хаця і не да канца. Таму лічыў, што нельга праследаваць старэйшых братоў у веры. Толькі лютая неталерантнасць крыжаносцаў выклікала нарастаючую варожасць мусульман. І яна, на жаль, дасюль расце.

Нарастаючай варожасці і канфліктаў паміж мусульманскім і хрысціянскім светам так і не ўдалося пазбегчы. Найбольш запальных пунктаў знаходзіцца цяпер менавіта на стыку гэтых двух светаў. І так напрыклад, у Косаве і Косавам балканскага канфлікту не развязалі, ён надалей тлее там. Палесцінскага канфлікту не развязалі і не надта рвуцца развязваць, а ён ужо моцна дыміцца. Каўказскі таксама дыміцца. Афганскі — яркім полымем палае ды канца і краю яго не відаць. Так бароніцца мусульманскі свет ад сілком навязваных яму заходніх дэмакратый.

Хутка магчымы аднак падобны канфлікт і бліжэй нас, значыць, у самым цэнтры еўрапейскай хрысціянскай стыхіі. У пошуках працы і лепшай долі ў багатыя заходнія дэмакратычныя краіны наехала ў свой час многа вернікаў Алаха. Там яны прыжыліся, закараніліся, моцна папраўляючы свой быт і, канешне ж, прычыняючыся да ўзросту дабрабыту гэтых жа краін. Але надалей засталіся яны тымі ж самымі ў нацыянальна-рэлігійным сэнсе нерэфармавальнымі, неасімілюючыміся мусульманамі. Яны штораз актыўней пачынаюць змагацца не толькі за свае сацыяльныя, але і нацыянальна-рэлігійныя правы, што, зразумела, не надта падабаецца карэннаму насельніцтву. Вось і нарастаюць канфлікты і яны будуць штораз вастрэй нарастаць. А час няўмольна працуе не на карэннае насельніцтва, а на прышэльцаў. Бо карэннае насельніцтва заходніх краін хутка старэе, курчыцца, а мусульманскае наадварот — маладзее, шпарка размнажаецца, павялічваецца. Менавіта так было ў Косаве і так хутка будзе і ў іншых балканскіх краінах. І ў далейшай перспектыве, калі нічога тут не зменіцца, тое ж самае чакае некаторыя краіны Заходняй, яшчэ хрысціянскай, Еўропы. Што ж рабіць, каб не дапусціць да гэтага?.. Дыягназ тут просты — трэба актыўней размнажацца, чаго еўрапейцы напэўна не зробяць, бо раскошнымі і лянівымі сталі. Калі ж мы, хрысціяне, не пачнем актыўней размнажацца, то наступныя нашы пакаленні будуць штораз больш мусульманападобнымі. І штораз вастрэй будуць нарастаць там нацыянальна-рэлігійныя канфлікты. Але не думаю, што заходнія краіны захочуць іх развязваць так, як яны ж развязалі гэтую праблему ў Косаве.

(працяг будзе)

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Аб сям'і

На працягу апошніх звыш двух месяцаў, па прычыне праблем са здароўем, не было мяне ў Беластоку і абмінулі мяне надта цікавыя падзеі, такія як самаўрадавыя выбары. Прыехаў я, калі з вуліц сталі ўжо памалу прападаць выбарчыя плакаты, і вось чую, што ўсё яшчэ не маем падляшскага маршалка (пішу гэты тэкст тры дні да сейміка, на якім можа яго ўжо вылучаць). Кажуць, мае ім стаць да гэтай пары ваявода ад Грамадзянскай платформы, а да гэтай пары віцэ-прэзідэнту Беластока з гэтай партыі, які ўвайшоў у сеймік, мае дастацца пасада ваяводы, або наступяць іншыя ракіроўкі ва ўлонні самой кіруючай (разам з ПСЛ) групоўкі. Пасля прыезду ўбачыў я таксама, што дэпутат Роберт Тышкевіч, былы старшыня рэгіянальных структур Платформы перасяліўся квартал далей з да гэтай пары супольнага дэпутацкага офісу, які засяляў мінш. з цяперашнім лідарам падляшскай ГП Дамянам Рачкоўскім.

Пасля прыезду ў Беласток неяк мала мяне гэтыя падзеі цікавілі. Можа пад улывам слабасці духу і цела падумаў я сабе аб сям'і, не так уласнай, як аб тых больш за шэсць мільёнаў сем'яў, выхоўваючых блізка адзінаццаць мільёнаў дзяцей да 24 года жыцця, якія функцыянуюць у нашай краіне. Прыгадалася мне сцвярджэнне выказанае бадай Сакратам Яновічам: „Дзяцей у нашай краіне гадуюць, а не выхоўваюць".

Гэты сказ прагучаў цяпер у маіх вушах, у сутыкненні з тым, які пачуў яшчэ хварэючы ад аднаго псіхолага, які, мабыць, натхніў мяне да гэтых сямейных роздумаў. Размаўлялі мы аб г.зв. функцыянальнай сям'і, г.зн. аб умовах, якія мае яна выконваць, каб усё было ў парадку, а дзеці дарасталі ў псіхічным здароўі. Так вось сям'я павінна задавальняць патрэбы не толькі матэрыяльныя, значыць, даваць пачуццё бяспекі і любові, ахоплівацъ узаемнай павагай, выконваць выхаваўчую і апякунскую ролю, даваць пачуццё прыналежнасці да таго якраз дому і сям'і. Мусіць рыхтаваць дзяцей да жыцця ў грамадстве, калі кожны з яе членаў павінен дбаць аб пастаяннае развіццё членаў сям'і, несці ўзаемную дапамогу, асабліва ў крызісных сітуацыях, ствараць умовы для шчырай і адкрытай камунікацыі (нельга засаромліваць дзіцяці і ўводзіць яго ў пачуццё віны), урэшце павінна справядліва дзяліць абавязкамі (не значыць, што пароўну).

Псіхолаг гаварыў мне, што здаецца быць зразумелым, мяркуючы па тым, што кожны з нас назірае і што адчувае:

— Найлепшая прафілактыка ад паталогій у сям'і гэта дом. Ад паталогіі найлепшай абаронай з'яўляецца блізкая эмацыянальная сувязь з бацькамі. Навуковыя даследаванні паказваюць, што паталогіі не ўзнікаюць у групе гэтых дзяцей, якія актыўна ўключаюцца ў рэлігійнае жыццё.

Як сцвердзіў, калі ў сям'і немагчыма расказваць уголас аб тым што кепскае ці не выяўляць пачуццяў і эмоцый, ужо можа быць гаворка аб дысфункцыянальнай сям'і. У такой сям'і ў прынцыпе дзеці ўвасабляюцца ў чатыры ролі: сямейнага героя (прабуе замяняць ролю бацькі), казла адпушчэння (хуліган, найгоршы вучань і да г.п.), блазна-цацкі (пастаянны жартаўнік і гарэза) або загубленага дзіцяці (анёлак стаяўшы збоку, без кантакту з атачэннем).

Думаю, што калядныя святы гэта знакаміты час, каб падумаць аб нашых сем'ях — ці ўсё там тое, што здаецца нам нармальным, з'яўляецца такім фактычна. І не толькі падзяліцца аплаткай ці просвіркай і пацалавацца пры свяце. Трэба проста размаўляць адно з адным, неабавязкова пры куцці, і не аб апошніх самаўрадавых выбарах.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

ХРАНІКЁРЫ БЕЛАРУСКАЙ ПАМЯЦІ

Каб стаць мужчынам, малады крывіч быў, між іншым, абавязаны распавесці сваім родным пра сваіх продкаў да пятага пакалення. Калі не змог, быў асуджаны на выгнанне. На гэты расказ спаслаўся вялікі беларускі пісьменнік Уладзімер Арлоў. У час прэм'еры спектакля „Ой давно, давно", якая прайшла 18 снежня ў Беластоку, прыпомнілі яго бацькі дзяцей — акцёраў, якія выступілі ў пастаноўцы. Сёння за няведанне свайго мінулага маладых людзей не чакае лёс выгнанніка. Ці гэта аднак абазначае, што не варта або не трэба ведаць сваіх каранёў?

— Дзеткам трэба распавядаць пра нашу мінуўшчыну, але неабавязкова пра ўсё. Не павінны жыць нашым жыццём, дастаткова, што мы гэта ўсё перажылі.

Спадар Сцяпан Бурыла прысутнічаў на прэм'еры спектакля перш за ўсё таму, што выступала яго ўнучка. Важным было пабачыць яе, таксама як і паслухаць расказаў з іншых вёсак, расказаў іншых бабуль і дзядуляў.

— Я не плакаў, — дадае. — Аглядаюся ўжо з аддалення, хаця помню як палілі Зані, Залешаны, Шпакі.

— Ой, як палілі, страшны момант.

— Так, пра тое, як палілі, — хвалююцца бабулі ўжо пасля выступу. — Слёзы нам каціліся. Успаміны вярнуліся. Яны такія маладыя.

І невядома ўжо, ці тыя маладыя гэта беларускія гімназісты, ліцэісты, што выступалі, ці можа маладыя — яны самі, бабулі і дзядулі. Твары пакаленняў пранікаюцца. На момант гэтыя бабці глядзелі ў твары сваіх унукаў нібыта ў люстэрка.

— Калі ў час вайны трэба нам было ісці, бацькі казалі: „Дзеткі, ідзем, калі гінуці, то разам!". Бог даў, што і яны, я, сястра, усе перажылі вайну, але мая сястра ўсяго гэтага не помніць. Не ведаем, колькі нам памяці застанецца на старасць, — гаворыць Людміла Місяюк. — Надта цешылася, калі ўнукі прыйшлі і папрасілі пераказваць. Яны не былі хаваныя на нашай мове, таму я вельмі хвалявалася, ці ўсё зразумеюць, але казалі: „Бабцю, нічога, калі будзе трэба, мама нам дапаможа". І сёння, калі чула гэтыя расказы, вельмі была ўзрушана. Не кожны мае добрую памяць, а калі здарыцца, трэба гэтым пакарыстацца.

* * *

„Ой, давно, давно... Беларускія гісторыі з Падляшша" гэта спектакль, які ў мастацкі спосаб падводзіць праект „Падляшскія хронікі". Амаль два гады моладзь, якая вывучае беларускую мову ў беластоцкіх школах, змагалася з матэрыяй гісторыі сваіх сем'яў. Гэтая праца дазваляла адкрываць лакальную гісторыю, пра якую часам ні словам не ўпамінаецца ў час школьных урокаў. Пачынала іх крыху больш, але засталіся Кася Бялькевіч, Дарка Вапа, Ніна Ваўранюк, Дарка Дажынка, Ігар Карнілюк, Оля Мазурук, Лідка Пякарская ды Юлька і Гаўрыіл Скаўронскія. Пералічыць трэба іх па прозвішчы, бо праца, якую ўклалі ў фінальны эфект, гэта адведзены іх свабодны час, гэта цярплівыя сустрэчы з бабулямі, дзядулямі, апрацоўка доўгіх расказаў, удасканальванне сваіх тэатральных здольнасцей, а таксама і цярплівасць аднаго да другога, бо правялі з сабой амаль два гады.

— Калі ў 2008 годзе мы сустрэліся з „Сейненскімі хронікамі", а пасля з „Тэрэмішчанскімі аповесцямі", прыйшло зразуменне, што і нам трэба гэта зрабіць, — гаворыць Аліна Ваўранюк, аўтар сцэнарыя і рэжысёр спектакля. — Яшчэ маем шанс карыстацца ўнікальнымі аповесцямі нашых продкаў, а маем цудоўную моладзь, якой хочацца раскрываць, а перш за ўсё маю надзею працягваць гэты пераказ між пакаленнямі.

Пераказ... які будуе нашу тоеснасць, хочацца дадаць. Якраз гэты пераказ у выпадку малых груп, якіх існаванне пад пагрозай, у тым ліку і многіх нацыянальных меншасцей, надалей мае вялікае значэнне. Даўным даўно сацыёлаг Маргарэт Мід тып культуры, калі старэйшыя пакаленні навучаюць малодшыя, назвала постфігуратыўнай і хаця сучасная цывілізацыя хістае гэтым узорам, мы да яго вяртаемся, каб рэстаўраваць нашу згубленую тоеснасць. Ёсць аднак і іншае пытанне, якое ўзнікае ў кантэксце гэтага спектакля і падобных мерапрыемстваў. Некаторыя ставяць пад сумненне сэнс перажывання мінуўшчыны чарговымі пакаленнямі, асабліва, калі перажыванне надта глыбокае, доўгатрывалае. Кожнае пакаленне гэта дзеці свайго часу, гаворыць Хасэ Артэга-і-Гасет у кніжцы „Што такое філасофія", а ўнікальным спосабам фарміравання пакалення з'яўляецца супольнае генерацыйнае перажыванне, найчасцей на аснове гістарычных падзей. Ці тады так важнае для нас, каб вяртацца да перажыванняў пакаленняў, якіх лёс амаль нам чужы? Пакаленне акцёраў спектакля праўдападобна ніколі не зразумее да канца чым для іх дзядоў была вайна (другая сусветная, іншых у будучыні, на жаль, не можам выключыць). Іх генерацыю будзе будаваць пэўна іншы вопыт, які ў часах далёка постмадэрністычных пакуль што цяжка вызначыць.

Выключнасць сітуацыі меншасці падказвае, што патрэбныя розныя ўзоры, каб памяць і бесперапыннасць захаваліся. Пашана для нашых продкаў нават патрабуе, каб не забываць. Аднак варта помніць, што наймалодшае пакаленне свой свет збудуе па-свойму. Бацькі і адлеглыя продкі ў змозе дастаўляць толькі цаглінкі, якімі дзеці пакарыстаюцца. Іх канструкцыя будзе іншая ды характэрная новаму пакаленню, але несумненна багатая і поўная толькі тады, калі захаваецца ў ёй праўда нашай мінуўшчыны.

* * *

— Гэты спектакль быў сапраўдны, бо дзеткі захавалі дакладна тую мову, на якой распавядалі ім свае гісторыі бабулі. Можа літаратурная мова з'яўляецца ўніверсальнай, але не так выдатна аддавала б сутнасць, — дзеляцца ўражаннямі спадарства Карнілюкі, а іншыя гледачы дадаюць:

— Універсальнае тут перш за ўсё тое, што паасобныя лёсы складаюць адну гісторыю, якая адлюстроўвае жыццё беларусаў Падляшша ў першай палове дваццатага стагоддзя.

Рацыянальныя рэцэнзіі перапляталіся ўвесь час з жывымі эмоцыямі. Вочы ў час спектаклю блішчалі і на публіцы, і ў маладых акцёраў, хаця выступоўцы перажывалі па-свойму:

— Трагедыя, проста трагедыя, — крытычна свае эмоцыі выказаў Ігар Карнілюк.

Дзяўчаты не былі для сябе больш талерантнымі, успаміналі кожную дробязь, якая не згаджалася з рэпетыцыяй. Усё ж такі аднагалосна падвялі цэласць:

— Так, хочам далей выступаць!

— Нас ужо перад хвілінай запрасілі ў Шчыты, — цешыцца апякунка праекта Аліна Ваўранюк, — але пастараемся аб'ехаць як найбольш месцаў, асабліва хочам завезці спектакль туды, дзе жывуць дзяды ўдзельнікаў праекта, бо якраз тыя людзі і тыя месцы сталі асновай пастаноўкі „Ой, давно, давно". Гэта беларускія гісторыі з Падляшша і таму спадзяемся, што будзе гэта таксама адна з лепшых форм сустрэч з людзьмі перад так важным для нашай беларускай грамадскасці набліжаючымся перапісам насельніцтва.

Мае ўражанні ад юбілейнай сустрэчы з Барскім

З нагоды юбілею Алеся Барскага на Яго малой айчыне — Беласточчыне — прайшла незвычайная сустрэча з паэтам, у якой і я меў гонар удзельнічаць. 11 снежня ў Беластоку сабралася сям'я Юбіляра, літаратары, навукоўцы, педагогі, дзеячы культуры, журналісты, былыя студэнты, землякі і аматары паэзіі. Удастоілі юбілейную вечарыну афіцыйныя госці, у тым ліку беларускія дыпламаты, якія павіншавалі Юбіляра і ўручылі кветкі ды падарункі.

Вельмі важнае, што ва ўрачыстасці ўдзельнічала моладзь, якая чытала вершы свайго славутага земляка Алеся Барскага. Моладзь — як сказаў сам Паэт — будучыня беларусаў. Гэта яны будуць вырашаць нашы справы — фармаваць нацыянальную свядомасць, развіваць беларускую культуру ў будучым.

Юбілейнай аўтарскай сустрэчы спадарожнічала выстава карцін Марыі Саковіч-Крашэўскай, ураджэнкі Юшкавага Груда. На іх былі прадстаўлены краявіды Міхалоўскай зямлі, сугучныя апісанням роднай прыроды ў паэзіі Юбіляра. Усе выступоўцы натхнёна прамаўлялі пра жыццё і творчасць Паэта, гучалі песні на Яго словы.

На сустрэчы панавала цёплая, сардэчная атмасфера. Стала яна яшчэ больш святочнай, калі ўсіх удзельнікаў вечарыны папрасілі прайсці ў другі зал пачаставацца велізарным тортам, якога хапіла для ўсіх.

Віктар БУРА

Беласток

Па гарачых слядах

8 снежня г.г. а гадзіне 13.30 ехаў я аўтобусам гарадской камунікацыі лініі № 100 з Васількава ў Беласток. Час я зафіксаваў, калі аўтобус спыніўся каля гандлёвай галерэі „Падляшская" па вуліцы Высоцкага.

Дык вось у гэтым аўтобусе некаторыя пасажыры падыходзілі да кампосцера білетаў, які прабівае дзіркі. Ды ён быў чымсьці запханы — паперчынай ці запалкай. Людзі совалі білеты, а яны не ўваходзілі і толькі камячыліся. Пасажыры пачалі шукаць новага кампосцера, ды ў аўтобусе людзей бітком набіта — не праціснешся.

А чаму вадзіцель не праверыць кампосцераў у вольны час, калі аўтобус спыніцца на канцавым прыпынку? І справе быў бы канец, і пасажыры не нерваваліся б. Варта праверыць, ці хуліганы (а яны былі і ёсць) чагосьці не натварылі. А яны і рысуюць, і смецяць, а і крэслы рэжуць. Ім што толькі ў галаву прыйдзе, каб штосьці папсаваць. Прыдаўся б маніторынг у кожным аўтобусе публічнай камунікацыі!

(яц)

Падзяка

Прыемна мне было чытаць справаздачу Касі Грыгарук, вучаніцы Гайнаўскага белліцэя з маёй аўтарскай сустрэчы, якая адбылася 19 кастрычніка 2010 года. Дзякую настаўнікам і вучням за запрашэнне і за цудоўныя хвіліны, якія я правёў падчас спаткання. Агромнае Вам дзякуй за дабрыню ды сардэчнасць, з якой заўжды мяне прымаеце. Вялікае Вам дзякуй, дарагія беларусы з Гайнаўкі, што заўжды памятаеце пра мяне.

З паважаннем, Юрка БУЙНЮК

ПУШЧА МОЖА БЫЦЬ НЕБЯСПЕЧНАЙ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

На полі Валянціна Васілюка са Звадзецкага дзікі так перацерабілі кукурузу, што ад яе асталіся толькі паламаныя сцёблы

Апошнім часам многа пішацца і гаворыцца пра Белавежскую пушчу і яе дабрадзействы, якімі карыстаюцца мясцовыя і прыезджыя людзі. Вядзецца гарачая дыскусія ці ўводзіць больш строгую ахову пушчанскай прыроды, у тым ліку птушак і звярыны. Затое мала гаворыцца, што пушча, напрыклад, у час пажараў, а перш за ўсё звярына, могуць быць таксама небяспечнымі для навакольнага насельніцтва і іх пажыткаў, аб чым добра ведалі нашыя продкі. Часта ахвярамі лясной жывёлы станавіліся хатнія жывёла і птушкі, а перш за ўсё пасевы. Зараз многа палёў, што абапіраюцца аб Белавежскую пушчу, найчасцей ляжаць аблагамі або расце на іх лес і ў такім выпадку лясная звярына выбірае для свайго харчавання нешматлікія сельскагаспадарчыя палі і лугі, што яшчэ абрабляюцца і нішчыць раслінную вытворчасць. Нешматлікія каровы, ці рэдка сустраканыя коні, якія яшчэ пасвяцца непадалёк ад пушчы, таксама апынуліся ў намнога большай небяспецы, чым гадоў дваццаць назад. Пушчанскія людзі баяцца, што на іх жывёлу могуць нападаць не толькі ваўкі, як гэта было раней, але і зубры, якія апошнім часам выходзяць з лесу і з'ядаюць траву на лугах.

Вялікія шкоды ад дзікоў

Мае суразмоўцы моцна наракалі на дзікоў, якія нішчаць пасевы побач Навасадаў, Арэшкава, Пагарэльцаў і іншых прыпушчанскіх вёсак.

— У мінулым хаця адгароджвалі пушчанскі лес ад нашых палёў і гэта ўжо абмяжоўвала выхад лясной звярыны на лугі і ворыва, — успамінала жанчына з Пагарэльцаў. — Зараз дзікі свабодна прыходзяць на нашае поле і цяжка ад іх адагнацца.

— Мы ўжо сабак трымалі каля палетка з бульбай, вогнішчы распальвалі і ўчынялі стукат, каб адагнаць дзікоў, а яны і так з'ядаюць нашу бульбу, — наракала жыхарка арэшкаўскага хутара.

Многа звярыны выходзіць з лесу і з'ядае бульбу і збожжа таксама гаспадарам Нараўчанскай гміны.

— Побач пушчы ўжо амаль ніхто не абрабляе зямлі з-за лясной звярыны. Зараз звярына есць збожжа і бульбу таксама далей ад лесу. Дзікі прыходзяць нават на маё аддаленае ад пушчы поле, рыюць зямлю і нішчаць бульбу і збожжа, а асабліва даспадобы ім даспелы авёс. Было нават так, што за ноч два дзікі перааралі мне палову паўгектарнага ўчастка, на якім пасаджана была бульба. Калі б дзікі елі па парадку, то крыху бульбы з'елі б, наеліся б і пайшлі б у лес, а яны перад усім шукаюць чарвячкоў, што ім вельмі смачныя і так перарыюць поле, што бульба ці збожжа не будзе ўжо там расці, — расказваў нядаўна Ян Драўноўскі з Міклашэва. — Апошнім часам побач вёскі Лясная (таксама Нараўчанская гміна — А. М.) паявіліся дзве ватагі ваўкоў, то ў хуткім часе могуць перацерабіць многа дзікоў, аленяў і іншую звярыну, што выходзіць з пушчы і з'ядае бульбу і збожжа. Аднак ваўкі небяспечныя таксама для хатняй жывёлы. Калі яны галодныя, могуць нападаць, напрыклад, на кароў. Апошнім часам не дазвалялі многа паляваць на ваўкоў, а калі яшчэ ўвогуле забароняць паляваць у прыпушчанскай зоне, можа быць цяжка пазбыцца ваўкоў.

Па прыпушчанскіх тэрыторыях гойсаюць зубры і алені

У верасні гэтага года зубр напаў на каня, які пасвіўся каля вёскі Доўгі Брод і забароў яго. Уласнік каня Пётр Грыцюк не мог дабіцца кампенсацыі, бо закон не прадбачвае такога выпадку, хаця баявітага зубра хутка адстрэлілі як небяспечнага для хатняй жывёлы.

— У Нараўчанскай гміне апошнім часам найбольш было праблем з зубрамі, якія выходзілі часта з лесу і затоптвалі меліярацыйныя равы. У гэтым годзе нішчылі яны таксама стагі з сенам і з'ядалі траву на лугах, выдзеленую для кароў. Вядомыя нам выпадкі, калі зубры нападалі і выганялі кароў з агароджы, каб дабрацца да свежай травы, бо яна ім намнога смачнейшая, чым некошаная трава на лясных палянах. Нават на сесіі Рады ў Нараўцы мы гаварылі пра шкоднасць зуброў для сельскагаспадарчай прадукцыі і тады адзін з нашых радных сказаў, што параілі яму абгарадзіць луг электрычным пастухом. Але ці ж гэты пастух можа спыніць зубра, калі ў яго такая тоўстая скура? — расказваў радны папярэдняга склікання Ян Целушэцкі з Ляўкова.

Лясная звярына нішчыць таксама новапасаджаны лес, як на прыватных, так і на дзяржаўных участках.

— Зубр за ноч можа з'есці верхавінкі саджанцаў нават на адным гетары лесу (зразумела, што не паўсюдна — А. М.). Скупаўскі гаспадар рашыўся пасеяць грэчку думаючы, што яна не будзе смакаваць лясной звярыне, а алені за 2 дні з'елі ўсю грэчку, — успамінаў Валянцін Васілюк са Звадзецкага.

Гаспадары з Навасадаў наракалі на аленяў, якія з'ядалі ім пшаніцу, а таксама на дзікоў, што нішчаць бульбу і іншыя пасевы. Можа і таму ад Навасадаў у напрамку лесу многа палёў ляжыць аблагамі, а на частцы з іх пачаў расці лес-самасей. У Валянціна Васілюка найбольшыя знішчэнні рабілі дзікі на пасевах распаложаных у напрамку лесу. У адным годзе дзікі з'елі яму ажно 2 гектары кукурузы.

Лясная звярына спрычыняецца да аварый

Зубра ў студзені гэтага года забіў цягнік на пуцях паміж Семяноўкай і Міклашэвам, а восенню 2009 года зубр выйшаў непасрэдна пад мікрааўтобус на дарозе ў Белавежу і таксама загінуў. Бус быў моцна знішчаны, вадзіцель не пацярпеў. У Белавежы, Нараўцы, Семяноўцы, Масеве, Тарнопалі і Арэшкаве паставілі ў гэтым годзе папераджальныя дарожныя знакі з выявай зубра. Маюць яны таксама прамацыйнае і адукацыйнае значэнне, паколькі віднее на іх надпіс „Увага! Краіна Зубра". Усё гэта было зроблена ў рамках праекта „Краіна Зубра — ахова зубра ў Белавежскай пушчы", які ад 2006 года быў рэалізаваны ў 11 пушчанскіх і прыпушчанскіх гмінах. Задачай праекта былі дзеянні ў напрамку перамяшчання зуброў на новыя тэрыторыі, бо мяркуецца, што толькі з нашага боку Белавежскай пушчы жыве ажно каля 450 зуброў і пушчанская тэрыторыя становіцца ім ужо малой. Можа і таму апошнім часам зубры сталі выходзіць на палі і лугі, з'ядаць траву, нішчыць стагі і палохаць кароў. Апошнім часам зубры сталі з'ядаць азіміну таксама ў наваколлі Крынак. Толькі з гэтага рэгіёна больш за 50 гаспадароў звярталася за кампенсацыяй за знішчаныя пасевы. Хаця кампенсацыя выплачваецца гаспадарам, то леснікі мала што могуць зрабіць, каб заахвоціць зуброў харчавацца ў лесе, бо ім зялёная азіміна больш смачная, чым сухое сена, якім падкормліваюць зуброў у лесе. Паявіліся нават прапановы, каб у наваколлі Крынак абгароджваць пасевы і гэтым самым ахоўваць іх ад зуброў, але пакуль невядома, хто меў бы фінансаваць гэтую інвестыцыю. Напэўна ў хуткім часе такіх агароджаў запатрабавалі б таксама сяляне з-пад Белавежскай пушчы, дзе зуброў намнога больш. У час перамяшчання зуброў паяўляецца таксама большая небяспека на дарогах. Зараз па пушчы і лясах трэба ездзіць больш асцярожна не толькі з-за лясных жывёл, але і з-за слізкіх, прыкрытых снегам дарог.

Спецыялісты лічаць, што можна было б заўважальна абмежаваць колькасць аварый з удзелам лясной звярыны, калі б нашы лясныя дарогі, прынамсі больш галоўныя, былі забяспечаны тэхнікай, якая адпалохвае звярыну ад дарогі, калі над'язджае легкавік ці грузавая машына. Паколькі з-за нястачы сродкаў такой тэхнікі ў Белавежскай пушчы няма, добра было б, каб экалагічныя арганізацыі пахадайнічалі, каб такую тэхніку паставіць хаця б на найбольш небяспечных адрэзках ваяводскіх дарог з Гайнаўкі ў Белавежу і з Гайнаўкі ў Нараўку, у месцах, дзе з дарогамі крыжуюцца маршруты лясной звярыны.

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

АРХЕАЛОГІЯ ПАМЯЦІ

— Кожны, хто з нашага рэгіёна, можа лёгка ўвайсці ў мае працы, таму што шмат у гэтым рэгіёне было такіх гісторый, якія ў іх прадстаўляю, — сказала „Ніве" ў беластоцкай галерэі „Арсенал" у час адкрыцця сваёй выставы „Гутарка" адна з самых таленавітых мастачак Польшчы, беларуска з роду Аляксандра Чарняўская.

Крытык Стах Шаблоўскі яе мастацтва акрэслівае магічным рэалізмам у сутыкненні з рэалізмам посттраўматычным, узнікаючым, між іншым, пад уплывам расказу дзядулі з перыяду апошняй вайны і перажытых самой сабою. Расказвае ён аб яе працах (без загалоўка; аб некаторых паказаных таксама ў „Арсенале"): „Мастачка паўтарае гісторыі пачутыя ў вёсцы. Вяртаемся на некалькі дзесяткаў гадоў. Вайна, мы на Падляшшы. Вось шматкультур'е памежжа, сапраўдныя Балканы поўначы. На вяселлі іграе музыка, ліецца гарэлка. Свішчуць кулі, брат забівае брата, падаюць трупы, бамбавозы кідаюць бомбы на статак кароў. Ёсць злачынства, помста і кара. Ёсць паляк, рускі і немец, а мясцовыя — беларусы. У лесе сядзяць лясныя, ад Усходу ідуць саветы, а ў вёсцы заўсёды знойдзецца гад, які прывядзе гітлераўцаў".

Магдалена Гадлеўская, куратарка выставы, у размове з „Нівай" у час вернісажу спаслалася на словы Стаха Шаблоўскага:

— Тое, што мяне цікавіць у творчасці Олі Чарняўскай, гэта археалогія памяці. Належыць яна да артыстаў маладога пакалення, якіх мучыць наша цяжкае мінулае. Ужо здавалася, што пра ўсё было сказана, што ўсе, хто хацеў адкрыць свае карані, адкрылі, ды аказваецца, што гэта няпраўда, і што маладая мастачка рашыла здзейсніць такое самае падарожжа ў сваё мінулае.

На выставе можам паглядзець у трох залах адзіночныя і калектыўныя партрэты памерлых і жывых, некаторыя чорна-белыя, перамаляваныя са старых фотаздымкаў. На іншых карцінах відаць дамы, нагадваючыя партрэты — як іх назваў іншы вядомы пісьменнік Ігнат Карповіч, пісаўшы аб творчасці Олі Чарняўскай — чорна-белыя або ў колерах зямлі, цьмяных, брудных. Урэшце зноўку, спасылаючыся на апісанне аднаго з твораў Ігната Карповіча, можна прыглядацца таксама карцінам найбольш апавядальным: „Бачым тут хаты і людзей. Хтосьці гаворыць да кагосьці. Хтосьці да кагосьці страляе. Хтосьці прыкладвае сабе дула да віска. Стаяць дамы, клуня, агароджа. Расце дрэва, расце карэнне".

Магдалена Гадлеўская тлумачыла нам:

— Гэты жывапіс лёгкі для ўспрымання ў сваёй апавядальнасці. Гэта выстава, якая вядзе апавяданне, расказвае гісторыю, збудаваную з розных матываў. Яны пахаваныя, іншым разам адкрываюцца ці паўтараюцца ў розных перспектывах.

Дадала:

— Вельмі файна працуецца пры выставе, якая расказвае прама, шмат толькі лёгкі пераход у бок пейзажа, кантакту з натурай. Прытым гэта мае карані ў тым, што я раней расказвала ў папярэдніх карцінах, яно з'яўляецца працягам папярэдніх гісторый, ёсць нейкія матывы ранейшых прац, паглыбленыя.

— Усё вяртаецца матыў разліку з мінулым, вайной і пасляваеннай гісторыяй вашай сям'і з беларускімі каранямі. Чаму?

— Я гэты разлік перш за ўсё вяду на свой прыватны ўжытак, а ў жывапісе ад двух гадоў. Гісторыя гэта невычэрпны мех. Гісторыю можна пазнаму адчытваць. Гэта відаць хоць бы тады, калі чытаем падручнікі гісторыі ў розных краінах. Калі адкрыемся на той пункт гледжання, складаная мазаіка будзе больш складанай, ды больш творча прыцягальнай.

Злева: намеснік прэзідэнта Беластока Аляксандр Сасна, намеснік старшыні Рады горада Беластока Славамір Назарук і Аляксандра Чарняўская

у ёй непасрэднасці, здавался б, зразумеласці, і гэта добрая якасць, а не штосьці, што гэтае мастацтва абцяжарвае.

Сама мастачка расказвала нам аб выставе:

— Першая зала неадназначная, крыху сонная, анірычная. У другой зале нашмат больш карцін, і робіцца крыху агрэсіўна, многа там расказаў і пераходзяць яны адны ў адны. Трэба гэта аднак адчытваць цэласна, а не трактаваць іх як асобныя карціны. Трэцяя зала — сцішаная. Павешаны там толькі чатыры карціны, гісторыі больш сямейныя і інтымныя, аснаваныя на партрэт.

Спыталіся мы ў мастачкі, што змянілася за год, калі бачылі мы яе ў час вернісажу „Сышчык" у адной з варшаўскіх галерэй. Оля Чарняўская адказала:

— Маё мастацтва развіваецца эвалюцыйна, не было ад таго часу нейкага скачка. У маіх працах наступіў

Год таму 26-гадовая цяпер мастачка прызналася нам, што адносна позна стала ў ёй даспяваць беларуская свядомасць (у час ліцэя). Спыталіся мы ў яе, як з той свядомасцю ў яе цяпер.

— Урэшце пачала я вывучаць беларускую мову. Хаджу на прыватныя ўрокі.

Сярод наведваючых выставу ў час вернісажу прыкмецілі мы намесніка прэзідэнта Беластока Аляксандра Сасну. Цікавіўся працамі над скульптурай, прысвечанай беластачаніну, стваральніку дакументальнага кіно Дзігу Вертаву, якую маюць устанавіць на рагу вуліц Легіяновай і Марыі Кюры-Складоўскай. Аўтаркай гэтага праекта з'яўляецца якраз Аляксандра Чарняўская. Скульптура стане там на пачатку 2011 года.

Выставу „Гутарка" можна наведваць да 9 студзеня.

Сібірскі лёс

Фота з сямейнага архіва сям'і Барташэвічаў

Ян Барташэвіч з Зубава калісь навучаў дзяцей рэлігіі ў кнаразоўскай школе і раз у тыдзень ездзіў у Кнаразы на чырвоным кані. Памёр Ян Барташэвіч у 1992 годзе, год пасля напісання гэтага верша пра ягонага брата Арсеня Барташэвіча, які пры цары астаўся вучыцца ў Расіі. У Другую сусветную вайну Арсень быў змабілізаваны на фронт. Там, на акопах, іграў ён на скрыпцы і варожая куля прабіла яму абое вачэй. Першая жонка Арсеня памерла, дачку Валю давёў ён да канца штудыяў і тады ўзяў другую жонку. На здымку з 1959 года Арсень Барташэвіч у Іркуцку з дачкой Валяй (ад першай жонкі) з ейным мужам (з якім пасля разышлася) і другая дачка (ад другой жонкі) з двойкай сваіх дзяцей.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Воспоминания

Далеко в стране Иркутской,
Между больших высоких гор,
Там стоит дом инвалидов,
Где проживал мой брат родной.
Жил с женой своей и дочкой,
Валентина имя ей,
Остались жить в Иркутске
Которая стала
их страной родной.
Он увечен был войною,
Пострадал оба глаза
И пришлося жить на свете
Калекой навсегда.
Написал письмо до дому
Отцу и матери своей:
Как мне трудно жить на свете,
Как хочется увидеть
всех родных.
Но к сожалению, глаза мои
Никогда не открыются уже.
Письмо как мама прочитала
Она упала в жаль большой,
Сыну милый мой, сказала,
За что тебя так лёс наказал.
Но нашлась одна девчонка,
Вышла замуж за его,
Берегла его, жалела
Как родного мужа своего.
Сама везде его водила,
Самого не пускала идти,
Ежедневно в лавках всё купляла:
Одежду, хлеб, просто все харчи.
Любил на скрипках он играть,
Играл по клубах и садах,
Молодёжь его на свадьбы
приглашала,
Чтобы при скрипках погулять.
В церковь он любил ходить,
Церковным хором управлял.
Все люди его любили
И чем кто мог то помогал.
И так жили они вдвоём,
Растили возлюбленную дочь
И надеялись что на старость
Будет им кому помочь.
Дочь нашла давние письма,
Прочитала всё до конца,
З них узнала что
за границей в Польше
Живут две сёстры
и брат его отца.
Написала в Польшу скоро,
Сообщила где живёт она
И просила: Дорогие,
Отозвитесь до меня.

1991-04-07

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Мараць жыць з культурай!

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Клас пяты „д” з настаўніцай Міраславай Маркевіч

Як гэта магчыма, што ўсе вучні ў класе падпісваюцца на „Ніву” і з нецярплівасцю чакаюць кожнага нумара, каб з цікавасцю зазірнуць у „Зорку”? І адразу, яшчэ на прыпынку, пачаць чытаць і рашаць крыжаванкі. Пасля многія дасылаюць адказы і ўдзельнічаюць у жараб'ёўцы ды атрымліваюць узнагароды, звязаныя з беларускай культурай або прадметы патрэбныя ў школе. Аказваецца, ключ да поспеху — просты. Хопіць любіць беларускую мову ды не толькі на словах, а найперш па сваёй ангажаванасці. Першы і самы складаны крок — гэта ўзяць у рукі беларускую газету або кніжку і прачытаць яе ад пачатку да канца. Наталька Шумелюк з пятага „ц” класа кажа, што захапіла яе кніжка *Усе нашы дзеці з Булербю* шведскай аўтаркі Астрыд Ліндгрэн. Кніжку прачытала па-польску і па-беларуску. І вось, больш даспадобы паказаўся ёй беларускі варыянт. Штосьці такое я пачула першы раз за свае семнаццаць гадоў рэдагавання „Зоркі”! Уразілі мяне таксама адносіны дзяцей са звычайных класаў да вучняў з так званых інтэграцыйных класаў. Аказваецца, разам можна гуляць на перапынках, удзельнічаць у гуртках зацікаўленняў, выступаць на сцэне. Большасць сяброў, якія далі інтэрв'ю для рубрыкі *Галерэя Зоркі*, адзначыла, што не пераносіць агрэсіі, хамства, крывадушнасці, маны. І ўсё нармальна, калі такая грамада вызначае атмасферу ў школе.

Вялікае значэнне маюць усякія гурткі зацікаўленняў, між іншым, гурткі беларускай мовы (якія настаўніцы Міраслава Маркевіч і Валянціна Бабулевіч вядуць на грамадскіх пачатках). Сярод вучняў пятага „ц” і „д” класаў мы налічылі аж чатыры лаўрэаткі (пісалі мы пра іх у папярэднім нумары). Дзяўчаты і хлопцы проста гараць, каб займацца спортам, удзельнічаць у музычных ды тэатральных гуртках, займаюцца грамадскімі справамі. Не дзіва, што калі прыйшлося выбраць асобы для *Галерэі Зоркі*, тут было аж дзевяць асоб! У гэтым месцы назавем іх прозвішчы: **Юстына Марчук, Міхась Красуцкі, Наталька Шумелюк, Ізабела Плуг, Іаанна Федарук, Ева Авярчук, Мартына Швед, Наталька Тамчук, Юліта Данільчук.** Кожны з герояў чымсьці здзівіў і захапіў. На жаль, амаль усе пасля вучобы хацелі б уцячы з роднага горада. Чаму? Бо тут, найперш, не было б для іх цікавай працы. Цікава, што ўсе прафесіі пасрэдна або і прама спалучаліся з галіной культуры. Аказваецца, формы, якія прапануюць нам установы, цесныя і адсталыя. Сапраўды, што гэта за горад, калі ў ім няма тэатра ці свайго тэлебачання ні звычайнага катка. Сучасныя дзеці мараць пра сцэнічныя досведы, прагнуць праверыць сябе ў якасці акцёрак, танцорак, інструктарак коннай язды, паліцыянтак. Хлопцы, зразумела, мараць стаць футбалістамі або інфарматыкамі.

Пасля візіту ў пятых „ц” і „д” класах, дзе пазнаёміліся мы з прыгожымі маладымі людзьмі, хацелася думаць толькі пра станоўчыя бакі нашага нацыянальнага характару. Тут кожны меў сваю ўлюбёную кніжку, ведаў сёе-тое пра музыку, думаў пра добрыя і дрэнныя паводзіны сярод аднагодкаў і дарослых.

ЗОРКА

Вікторыя Патонец

Фота Міры Лукшы

Васьмігадовая Вікторыя з Новага Ляўкова першы год вывучае беларускую мову ў комплексе школ у Нараўцы. Рашылася яна прыслаць на літаратурны конкурс беларускай паэзіі і прозы тры свае кароценькія вершыкі. Аказалася — сёлета была адзіным удзельнікам конкурсу з пачатковых школ! Калісьці шмат маладых паэтаў з нараўчанскай школы, таксама вучняў настаўніцы беларускай мовы Анны Кандрацюк, прымала ўдзел у гэтым конкурсе! Так было іх многа, што нават узнагарода была ўручана і настаўніцы, запрошанай на ўрачыстае завяршэнне конкурсу. А ўзнагароды атрымліваюць не толькі пераможцы , а ўсе ўдзельнікі — многа цікавых кніг і дыскаў з музыкай.

У марозны снежаньскі дзень Вікторыя прыехала з мамай на машыне. І вельмі перажывала — была найменшай удзельніцай конкурсу, да таго дэбютанткай! Чытала свае вершыкі перад такой аўдыторыяй, падпісвалі ёй кнігі такія вядомыя аўтары, як Віктар Швед і Ян Чыквін! А яшчэ і давала інтэрв'ю — для Радыё Беласток і Радыё Рацыя! А яна ж ніколі не прапусціць Падляшскага канцэрту пажаданняў, які пачынаецца ў 18 гадзіну ў суботу! А пытаўся ў яе сам Зміцер Косцін, які вельмі часта вядзе гэты канцэрт!

— Напісала я верш пра яблыньку, лета і ўяўнога ката! — сказала маленькая паэтэса. — Жыву ў Ляўкове. Хаджу ў другі клас школы ў Нараўцы. Люблю школу, чытаць і музыку. Да ўдзелу ў конкурсе намовіла мяне мама. Люблю слухаць Радыё Рацыя. І хаджу на рэпетыцыі калектыву „Цаглінкі”.

Фалькорны калектыў „Цаглінкі”, заснаваны ў Старым Ляўкове ў 1976 годзе, старэйшы нават ад бацькоў Вікторыі — мамы Элі і таты Міхала! Бабуль і дзядуль Вікторыя мае ў Прыбудках і ў Ляўкове — яны, так як і яна, таксама любяць беларускую песню і слова.

Міра ЛУКША

Вікторыя ПАТОНЕЦ, ПШ у Нараўцы

Яблынька

Стаіць яблынька за плотам,
і яблычкі на ёй як золата.

Восень

Надышла каляровая восень.
Яна нам багацце прыносіць.
А дзеці што скажуць на гэта?
Канец ужо забаў і лета!

Уяўны аб'ект

Быў аб'ект, які хацеў
пералезці праз плот.
Ці можа гэта быў кот?
Быў гэта кот Нібыта.
І плот быў таксама нібыта!

Урок жыцця

(быліца беларусаў ад Падляшша)

— Гэта не выдумка, — кажа баба Жэня з Новага Ляўкова, — гэта чыстая праўда. Гэта здарылася ў суседняй парафіі, за лесам. Толькі я ўжо забылася як называлі гэту сям'ю...

(Так, менавіта, пачынаюцца ўсе падляшскія быліцы і легенды. Яны *адбываюцца* заўсёды побач нас, каб кожны, хто прачытае ці пачуе, падумаў: а можа і ён сам ведае нашых герояў?!)

Паслухайце. У бацькоў была дачка-адзіначка. Барвай яе называлі. Прыйшоў час, пачалі ехаць у сваты. Барва не супраць пайсці замуж. Але яе маці і бацька дрыжэлі за лёс дачкі. У прыгажуні рукі да работы не прыставалі. Ну, нічагуська яна рабіць не хацела. Адно каб прыгожа апрануцца і шпацыраваць па вуліцы як якая мяшчанка!

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Да Барвы пасватаўся Барыс, сын багацеяў з суседняй парафіі. Бацькі адмаўлялі хлапца як умелі:

— Не бяры яе, яна ж нічога рабіць не ўмее!

— Не хвалюйцеся, мілыя, — адказаў ім будучы зяць. — Я навучу яе рабіці...

Згулялі вяселле. Паехала Барва жыць у чужую старонку, да чужых людзей. Спачатку бацькі чакалі, калі іх Барвачку адашлюць дамоў. Хто ж будзе такую нерабацяшчую трымаць у сям'і? Мінае месяц. Мінае другі. Дачка не вяртаецца. Пасля трох месяцаў давай самі ехаць, пабачыць, што там абдываецца. Можа памерла ўжо і ніхто ім не паведаміў аб няшчасці?!

На месцы яны не пазналі роднай дачушкі. Іх Барвачка, як вавёрка, завіхалася на кухні, гатавала абед, прыбірала ў хаце, чысціла пасуду, мыла адзежу ды яшчэ спявала пры рабоце. Бацькі ад здзіўлення аж прыселі на лаве.

— Не сядзіце як якія дармаеды, — папракнула іх дачуся. — Лепш схадзіце ў поле і дапамажыце пратаць атаву майму Барысу. Інакш вам ён есці не дасць!

Бацькі нічога не сказалі. Яны задаволеныя выйшлі з хаты і пайшлі ў поле, найперш, каб падзякаваць мудраму зяцю, што навучыў іх дачку жыць.

І вось даражэнькія, мабыць, гэтая быліца пакажацца вам брутальнай і недарэчнай. Але калі прачытаеце яе сваім бабулям, яны падтакнуць. І скажуць: так было. І параяць вам вучыцца працаваць, бо толькі тады чалавек паўнацэнны.

ЗОРКА

Фота Іланы КАРПЮК

Музыка з кайфам

Бераг Алега, бераг Надзеі

Мастакоў жыццё часта бярэ знянацку. Бывае, што нечакана перасякаюць яны межы сваіх прафесій. Паэты выступаюць на сцэне, жывапісцы ствараюць музыку. Аказваецца тады, што быць мастаком гэта цяжкая праца, а ацэнку і так дадуць наступныя пакаленні.

Жывапісец, бард, вакаліст-харавік Алег Кабзар прыналежыць зусім іншаму пакаленню, чым паэтэса Надзея Артымовіч. Ён прыехаў з Беларусі, яна — беларуска з Бельска-Падляшскага. Сустрэліся ўпершыню ў час „Сустрэч «Зоркі»" (праходзілі яны тады ў Нарве). Нашы „Сустрэчы" гэта якраз месца, дзе маладыя людзі спатыкаюць асоб розных мастацкіх і грамадскіх прафесій, якія часам становяцца для іх узорам, бываюць аўтарытэтам, бывае, застаюцца сябрамі.

Першая сустрэча Алега з Надзеяй пакінула так значны след, што яны проста мусілі спаткацца ізноў.

— Я маляваў стары Бельск, — успамінае Алег. — Бывала, што тады міналіся на вуліцах горада. Загаварылі, абмяняліся думкамі.

Алег пачаў пазнаваць творчасць Надзеі. Моцна яго кранала, да касцей, таму ўсё часцей браў у рукі гітару і граў мелодыі. Так крок за крокам узнікалі песні на словы Надзеі Артымовіч.

— Дванаццаць гадоў спатрэбілася, каб дапоўніць гэтыя перапоўненыя творчымі гутаркамі сустрэчы і запісаць тое, што нам супольна атрымалася, — гаворыць музыка.

І ёсць. У апошніх днях з'явіўся доўгачаканы дыск. Яго загаловак „Бераг". Па-першае, мае ён дачыненне да апошняй песні, якая ўзнікла ў апошнім годзе, але, як тлумачыць сама Надзея Артымовіч, „бераг" мае таксама значэнне „краю", быцця „на краі", „у моманце пералому". З расказаў абодвух герояў праекта ведаем, што праца над дыскам сапраўды каштавала мастакоў многа энергіі. Гэта таксама момант падвядзення супольнай шматгадовай працы, таму, несумненна, можна гэта назваць пераломам.

Зразумець супольную творчасць Надзеі і Алега нялёгка, асабліва падлеткам, але, як адзначае Алег, „усё залежыць ад колькасці і якасці нашага жыццёвага вопыту", а дасведчанне набываем у кожным годзе свайго жыцця. „Мяне найбольш кранаюць якраз тэксты Надзеі, якія ўзніклі ў раннім перыядзе яе творчасці, — зазначае Кабзар, — гэта, здаецца мне, доказ, што ў кожным узросце можна перажываць і бачыць свет вельмі сур'ёзна, з глыбокай рэфлексіяй".

Калі хочаце закахацца ў таямнічы Бельск, пазнаць цудоўную рытміку белага верша Надзеі Артымовіч, варта ўзяць кніжку, а таксама паслухаць альбом „Бераг", на якім, апрача Алега Кабзара, паяўляюцца гітарыст Марк Яраш ды віяланчэлістка Вераніка Хмель.

i_basovka@o2.pl

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

1. Імя і прозвішча: Ева Авярчук (V „д" клас Комплексу школ з беларускай мовай навучання № 3 у Бельску-Падляшскім).

2. Твой любімы прадмет: беларуская, польская, англійская мовы.

3. У жыцці хачу стаць: журналісткай або пісьменніцай.

4. У сяброў цаню: вернасць.

5. Не люблю: хамства і эгаізму.

6. Па-беларуску размаўляю: з бабуляй.

7. Кніжка, якая цябе захапіла: чытаю ўсе кніжкі, якія трапляюць у мае рукі.

8. Падабаецца табе музыка: поп-музыка.

9. Твае ўлюбёныя стравы: спагеці.

10. Твой любімы спосаб адпачынку: пісаць вершы і апавяданні, слухаць музыку.

11. Калі дарасту хачу жыць: у Гажове-Велькапольскім, бо начыталася пра гэты горад і ён мне спадабаўся.

Польска-беларуская крыжаванка № 52

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 48:

Клубок, аса, сяло, плот, клон, слон, вада, лес, гіт, стол. Алі, клямка, свет, клас, плод, калона, сон, мат, анёл.

Узнагароды, кампакт-дыск „Бераг" (з паэзіяй Надзеі Артымовіч і музыкай Алега Кабзара) выйгралі **Марта Скарбіловіч, Габрыель Кузьміч, Марта Бручко, Вікторыя Артэмюк, Магдалена Ваўранюк, Дамініка Асташэўская, Іаанна Кобус** з Бельска-Падляшскага, **Крыстыян Грушэўскі, Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



Юрка БУЙНЮК

Мае настаўнікі са школы ў Малінніках

У наступным годзе міне 15 гадоў з часу, калі я закончыў пачатковую школу ў Малінніках і 10 гадоў — калі школа перастала існаваць. Памятаю, як у чацвёртым класе пачатковай школы на ўроку фізікі настаўнік Юры Сібясевіч прадбачыў, што малінніцкая школа перастане існаваць, а на ўсю Арлянскую гміну будзе толькі адзін школьны комплекс.

Калі я пачынаў вучыцца, то ў нашу школы хадзілі дзеці з трох вёсак: Шарнёў, Рыгораўцаў і маіх Малінник. Найбольш вучняў было з нашай вёскі. Маё пакаленне — народжанае ў 1975-1981 гадах — ставілася да настаўнікаў з вялікай пашанай. Для іх настаўнік быў вялікім аўтарытэтам таму, што нашы бацькі і дзяды таксама паважалі настаўнікаў і так нас выхоўвалі. Настаўнік мог звярнуць увагу, калі вучань дрэнна сябе вёў на занятках. У малінніцкай школе былі вельмі добрыя настаўнікі. Ідучы ў школу я бачыў, як а гадз. 7.20 раніцы настаўнікі выходзілі з аўтобуса, які ехаў з Бельска ў Кляшчэлі. Зараз той аўтобус не спыняецца ў вёсцы, бо школы няма і настаўнікі ў Малінніках не прыязджаюць.

Першай маёй выхавацелькай у нулявым класе — у які я паступіў 1 верасня 1987 года — была пані Аліна Амельяновіч. На здымку яна — маладая, прыгожая бландзінка — стаіць з хлопчыкамі і дзяўчынкамі на фоне цвітучага бэзу. Гэта яна навучыла мяне пісаць ды чытаць на польскай мове. Дарэчы, польскую мову я спазнаў у школе. У хаце з бацькамі ці на панадворку з равеснікамі я размаўляў на беларускай гаворцы. Другой маёй настаўніцай была пані дырэктар Вольга Стэльмасяк, якая добра вучыла нас матэматыцы. Дарэчы, пані дырэктар цудоўна гаварыла на беларускай мове. Тэхнікі ды музыкі вучыў мяне Віталь Зінкевіч, а яго жонка Аліна старэйшых вучняў вучыла польскай мове. Рэлігіі вучыў настаяцель Падбелянскага прыхода пакойны айцец Мікалай Блізнюк. Гэта быў вельмі сардэчны чалавек і ласкава ставіўся да нас.

Калі я быў у другім класе, да Малінник дайшлі вучні і настаўнікі са школы ў Вульцы-Выганоўскай, якая ў 1989 годзе была закрыта. Тады пачаў я вывучаць беларускую мову, якой вучыла нас матушка з Вулькі-Выганоўскай Марыя Саевіч. Яна запамяталася мне як вельмі сімпатычная і прыхільная настаўніца. Яна ўмела зацікавіць вучняў беларускай мовай, часта пазычала мне беларускія кнігі. Таксама памятаю другую настаўніцу беларускай мовы — паню Карпюк, якая вучыла іншыя класы і таксама была добрай настаўніцай. Раз, замяняючы Марыю Саевіч, вяла з намі ўрок беларускай мовы, на якім мы пісалі пісьмо ў „Зорку". Любіў я таксама школьную бібліятэкарку паню Марысю. Бібліятэку я наведваў вельмі часта, бо змалку любіў чытаць кнігі. У маім дзяцінстве кніга была мне цікавей за сённяшнія фільмы ці музыку. Любоў да кніг перадалі мне бацькі і дзяды. У мяне па сённяшні дзень ёсць прывычка збіраць кнігі. Кніга — здаўна мой найлепшы прыяцель.

Фота архіў Нівы

Школьнікі з Малінник прыбіраюць лісце, 1979 г. Калі хтосьці з нашых чытачоў распазнае хто знаходзіцца на здымку ўключна з настаўніцай, просім даслаць інфармацыю ў рэдакцыю

У верасні 1991 года дайшло да нас шмат вучняў з ліквідаванай школы ў Пашкоўшчыне — з вёсак Пашкоўшчына, Градалі, Тапчыкалы і Кошкі. З гэтых вёсак было шмат таленавітых вучняў, якія закончылі вышэйшыя ўстановы ва ўсёй Польшчы.

У чацвёртым класе адышла ад нас наша выхавацелька Аліна Амельяновіч, а нашым выхавацелем стаў Юры Назарэвіч. Запамятаўся ён мне як адзін з найлепшых настаўнікаў у маім жыцці. Ён вучыў нас некалькім прадметам: гісторыі, біялогіі, геаграфіі і музыцы. На яго ўроках было вельмі цікава і ніхто не нудзіўся. Часта пан Назарэвіч пазычаў мне кнігі, за што я ўдзячны яму па сённяшні дзень. Сцяпан Пракапюк, бацька Маргарыты Пракапюк, вучыў нас гісторыі. Я вельмі любіў яго ўрокі. Ён быў строгім настаўнікам, шмат нас навучыў і ўмеў зацікавіць сваім прадметам. Ён таксама вучыў расейскай мове, якую цікава было вывучаць. Прыемна ўспамінаю Уладзіміра Калішука з маёй вёскі, які год вучыў мяне польскай мове ды матэматыцы. Пасля ўрокаў прыходзіў я да яго на карэпетыцыі з матэматыкі, а ён дазваляў мне пагуляць на камп'ютары, які купіў першым у вёсцы.

Думаю, што ў мяне былі вельмі добрыя настаўнікі. Цешуся, што магу іх успомніць добрым словам ды падзякаваць ім за вучобу. Але і я быў добрым вучнем. Мяне настаўнікі паважалі, пазычалі кнігі і дапамагалі ў вучобе. Дзякую ім за навуку і прыемныя ўспаміны, якія я вынес са школы ў Малінніках.

А мне шкада традыцыі...

Уладзімір СІДАРУК

Як хутка плыве час. Не паспелі азірнуцца, як прыйшоў снежань, а з ім канец года. Чарговы раз будзем вітаць Новы год, рыхтавацца да Каляд і Шчодрага вечара. Зараз, калі чалавек застаецца ў адзіноцтве, сягае ўспамінамі да мінулых будняў. Вось як раней у нашай сям'і і вёсцы рыхтаваліся да Ражджаства Хрыстовага.

Тыдзень перад каталіцкімі Калядамі пачыналі мы з братам рыхтаваць гвязду. Штогод аднаўлялі яе каляровай паперай, затым ішлі калядаваць. На першы дзень (25 снежня) калядавалі ў сумежнай з Кузавай „Глупні" (забудовы побач вадакачкі), а на другі дзень прыходзілі да знаёмых каталіцкіх сем'яў пры брэсцкім пуці ў Чаромсе. Закалядаваныя грошы дзялілі мы пораўну і бацькам не аддавалі. Пакідалі сабе. Пасля калядавалі на праваслаўныя Каляды.

Фота Міры ЛУКШЫ

Да Куцці рыхтаваліся ўжо зранку. У куточку пад іконай ставілі „каляду", жменьку звязанага жыта з калоссем. Матуля са старэйшымі сёстрамі ды бабулькай Марыяй (бацькавай маці) рыхтавалі стравы. Абавязкова мусіла быць дванаццаць страў. Асноўнымі лічыліся куцця з макам, аўсяны кісель, акрашаны льняным алеем, тушоная капуста з грыбамі, смажаныя грыбочкі, марынаваныя селядцы, смажаная рыба, бліны, шчолак з фруктаў, варэнікі з макам. Бацька займаўся працай на гаспадарцы. Даглядаў жывёлу, насіў апал, абсталёўваў ёлку. Упрыгожанне ёлкі было нашым абавязкам. Ёлку мы ставілі вялікую, ад падлогі па столь. Ставілі яе ў драўляны „крыжак" ды прыбівалі цьвікамі да падлогі. Пад ёлкай ставілі Дзеда Мароза з кардону, якога бацька прывёз з Аўстрыі, вяртаючыся з канцлагераў. Абсыпалі мы яго ватай, быццам белым пухам. Чаплялі каляровыя ланцужкі ўласнай работы, шарыкі, цукеркі-„соплі", коржыкі рознага віду, яблыкі ды ставілі каляровыя „кручаныя" свечкі. На версе замацоўвалі своеасаблівую каляровую бомбку-шпіцу. Калі такой не было, дык чаплялі „залатую звязду". Атракцыёнам мусілі быць „зімныя агні", якія запальвалі ў час калядавання. Бацькі прытрымліваліся звычкі і назіралі, хто першым з'явіцца ў дом на Куццю. Калі завітаў мужчына, дык казалі, што пры ацёле кароўка прывядзе бычка, калі жанчына, дык цёлачку. Гэтае меркаванне заставалася ў нашай вёсцы даўжэйшы час.

Да вячэры сядалі пры першым змроку, калі закончылі працы ў гаспадарцы. Стол засцілалі белым абрусам, пад які клалі сена. Пакідалі адно вольнае месца для нечаканага госця. Перад спажываннем страў гаварылі малітву. Кожны з сямейнікаў мусіў абавязкова пакаштаваць дванаццаць страў. Ад стала адходзілі разам. Неспажытыя стравы непрыбранымі заставаліся нанач для тых, што адышлі ў вечны спачынак. Пасля вячэры дзяўчаты выходзілі на панадворак і слухалі, у якім баку забрэша сабака. Гэта мела абазначаць, што з таго боку прыбудзе жаніх.

Першы дзень Хрыстовага Нараджэння праводзілі ў сямейным крузе. На другі дзень запрашалі гасцей. Пасля наступаў час адпачынку. Ад Куцці па трэці дзень Вадохрышча вечары лічыліся „святымі" і ў гэты час нельга было нічога рабіць, нават збірацца на пакудзелле. Моладзь збіралася па кватэрах ды гуляла ў рознага віду гульні. Самай папулярнай забавай была гульня ў фанты.

Рыхтуючыся да Каляд, амаль у кожнай хаце калолі вепрука ды рыхтавалі смакавітыя каўбаскі, кумпякі, сальцісоны і своеасаблівую грэчневую кішку. Гэтую спажывалі на Гагатуху перад навагоднім вечарам 13 студзеня. Бяднейшыя сем'і, якія не займаліся жывёлагадоўляй, куплялі палавіну вепрука і таксама рабілі вырабы. На святочным стале гасцяваў аржаны хлеб, пірог і пячэнне ўласнай вытворчасці. Мяснымі вырабамі з крамы мала хто на вёсцы карыстаўся, бо і грошай замнога людзі не мелі. Затое ў народзе трымалася звычка ўзаемнай пашаны для чалавека. Людзі жылі ў згодзе і дружнай сям'і...

Зараз усё перамянілася. Міжлюдскія суадносіны адышлі ў забыццё. У сям'і брат з братам не ладзіцца, бацька з сынам. Не гавару ўжо пра суседзяў. Вёскі адміраюць. Адыходзіць у краіну вечнасці старэйшае пакаленне і забірае з сабою цудоўныя абрады. У Кузаве, напрыклад, няма ўжо сапраўдных земляробаў. На пальцах адной рукі можна такіх палічыць. „Свінабіццём" займаюцца нямногія. Большасць карыстаецца мяснымі вырабамі з крамаў. А закупкі святочныя робяць „на раты", пачаўшы перад каталіцкімі Калядамі, а закончыўшы перад праваслаўным Ражджаством Хрыстовым. Вось такая праўда.

Успамін вайны

Пётр АХРЫМЮК, Варшава

Камунікацыйны вузел Нарва

У снежні 1943 г. па Старым Ляўкове маланкай разышлася вестка пра акружэнне пад Сталінградам нямецкай арміі фельдмаршала фон Паўлюса. Людзі сталі гаварыць, што набліжаецца канец гітлераўскага панавання. Па Старым Ляўкове стала ў той час кружыць выразка з замежнай прэсы з фатаграфіяй Паўлюсавага салдата. Быў ён апрануты ў жаночае футра, рукі трымаў у муфце, ногі яго былі закручаны анучамі, а на галаве меў жаночыя трусы — вельмі камічна выглядаў той непераможны нямецкі салдат.

Постіндустрыяльнае возера ў пясчаным кар'еры каля Старога Ляўкова

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Зіма 1943/44 года была вельмі лютая, мароз сягаў амаль пяцідзесяці градусаў. Былы салдат Паўлюсавай арміі, з якім мне давялося пазней працаваць у Гіжыцку, гаварыў, што салдаты, не маючы паліва, разбівалі карабіны і распальвалі кастры з драўляных прыкладаў ад іх; голад і холад сеялі там смерць. Батальёну, у якім ён служыў, была пастаўлена задача здабыць завод, у якім выраблялі бульдозеры „Сталінец". Калі салдаты батальёна падышлі да варот завода, раптам з іх выбеглі рабочыя, узброеныя ў карабіны са штыкамі, гатовыя да рукапашнай схваткі. Немцаў ахапіла паніка і яны без бою далі драла на свае ранейшыя пазіцыі. Вермахт стаў цярпець паражэнне за паражэннем.

У 1944 годзе фронт набліжаўся да ўсходніх граніц Польшчы і па Старым Ляўкове разнеслася вестка, што ўсходні фронт немцаў разарваны і Савецкая Армія наступае на захад. Як высветлілася, была гэта партызанская дывізія, якая атрымала задачу разведаць тылы акупанта і дарогі ў напрамку Сямятыч, па якіх мелі наступаць савецкія салдаты. Акупацыйныя ўлады неадкладна сталі сцягваць падраздзяленні вермахта, гестапа і жандармерыі з усёй Беластоцкай акругі. Камандаванне вермахта загадала арганізаваць абаронную лінію, каб загарадзіць партызанам адступленне ў Белавежскую пушчу; у гэтым мерапрыемстве ўдзельнічаў таксама атрад немцаў пад камандаваннем лейтэнанта Фрыца Неймана, які базаваўся ў Старым Ляўкове. Як расказаў адзін салдат з гэтага атрада, які ў час акцыі быў паблізу свайго камандзіра, партызаны з ходу пайшлі ў наступленне на нямецкія пазіцыі; завязаўся бой, у выніку якога былі забіты і паранены салдаты абодвух бакоў. Партызаны разарвалі абаронную лінію і цераз пралом прайшлі ў пушчу. Да аднаго з ляжачых раненых партызан пабег лейтэнант Нейман з пісталетам у руках. Калі аставалася толькі некалькі крокаў, партызан раптоўна адвярнуўся і паслаў у немца чаргу з кулямёта. Уміраючы Нейман выказаў апошняе пажаданне, каб па смерці абвезці яго над Белавежскай пушчай і над вёскай Старое Ляўкова. Яго пажаданне было задаволена — ягонае цела ў спецыяльным мяшку загрузілі ў самалёт „Шторх", які праляцеў над пушчай і над вёскай.

У красавіку 1944 года ў вёску Семяноўка, што распаложана над ракою Нарвай, прыехалі нямецкія сапёры і сталі ўзводзіць абарончыя збудаванні. Зямныя працы выконвалі жыхары Семяноўкі і навакольных вёсак. Першая лінія акопаў і сховішчаў пралягла паблізу чыгуначных пуцей, а наступная была эшаланіравана чатырыста метраў далей. У тым часе нямецкія сапёры ўзарвалі чыгуначныя масты на Нарве і Нараўцы ды дарожныя масты на тых жа рэчках, а на подступах да мастоў заклалі супрацьтанкавыя міны. Чыгуначныя пуці, пратокі і тэлеграфныя лініі на адрэзку ад Семяноўкі да Гайнаўкі знішчылі дашчэнту. У той час камандзір падраздзялення вермахта, што базаваўся ў Старым Ляўкове, загадаў васьмі гаспадарам пад'ехаць фурманкамі пад школу, дзе кватаравалися немцы. Салдаты загрузілі свой рыштунак і загадалі ехаць у напрамку Бельска-Падляшскага. Пад Браньскам камандзір атрада загадаў гаспадарам пакінуць фурманкі і вяртацца да сваіх дамоў. У пачатку ліпеня 1944 года абарончыя пазіцыі каля Семяноўкі заняў батальён нямецкіх салдат; адзіная дарога ад іх злучала Бабігару з Семяноўкай. Савецкія разведчыкі ў сіле батальёна пераправіліся на пантонах цераз Нарву, выйшлі на тыл праціўніка і гадзіну пасля поўначы рушылі ў атаку. Немцаў, якія бальшынёй спалі ў сховішчах, ахапіла паніка — выбеглі яны адтуль без мундзіраў і басанож; амаль усе яны апынуліся ў савецкім палоне.

Другім нямецкім пунктам абароны стаў камунікацыйны вузел Нарва, адкуль выходзілі дарогі ў напрамку Бельска-Падляшскага, Гайнаўкі і Беластока; тут абарону заняў адборны полк вермахта. Дзень пасля адыходу немцаў на дарозе са Старога Ляўкова ў Капітаншчыну з'явіліся савецкія салдаты і распытвалі мясцовых жыхароў: ці не бачылі немцаў, калі і ў якім напрамку адышлі. Каля 20 ліпеня перадавыя атрады Савецкай Арміі прабавалі з ходу авалодаць Нарвай; пасля няўдалага наступу адышлі яны на ранейшыя пазіцыі. Каля 24 ліпеня савецкія салдаты пачалі падрыхтоўку да штурму Нарвы. Гадзіну да поўдня ў небе, на вышыні каля паўтара кіламетра, паявіліся 24 штурмавыя самалёты Іл-2 у баявым парадку, роўна ад сябе аддаленыя, як на парадзе; ляцелі яны ў напрамку Нарвы. Па надлятаючых самалётах нямецкія зенітчыкі адкрылі агонь, выбухаючыя каля іх снарады ўтваралі невялікія белыя аблочкі; я падумаў, што пазбіваюць усе самалёты. Але самалёты надалей ляцелі ў баявым парадку і раптам з гэтага строю адхіляліся адзіночныя машыны і пікіравалі на баявыя пазіцыі зенітчыкаў, страляючы з бартавых кулямётаў і скідаючы бомбы. Зенітная артылерыя замоўкла, а самалёты падымаліся з пікіравання і вярталіся ў баявы парадак; зноў налічыў я 24 самалёты — значыць ніводнага з іх немцы не збілі. Пасля кароткага перапынку пачаўся ракетны абстрэл нямецкай абароны з „Кацюш". Гул быў такі, быццам падымалася сотня рэактыўных самалётаў, быццам біла сто грамоў. Жыхары вёскі Ваські расказвалі, што пасля абстрэлу з „Кацюш" гарэла зямля. Ад гарачыні большасць нямецкіх салдат у акопах спеклася жыўцом. Ацалелыя вырываліся з акопаў і беглі ўсляпую. З адборнага нямецкага палка ўцалела каля ста васьмідзесяці салдат. На другі дзень пасля заканчэння бітвы захопленых немцаў канваіравалі на школьны пляц у Старое Ляўкова, выстраены яны былі ў тройкавыя калоны па шэсцьдзесят чалавек у кожнай. Па абодвух баках калон ішлі савецкія салдаты з гатовымі да выстралу пэпэшамі. Мне тады было трынаццаць гадоў і я з вялікай цікавасцю прыглядаўся немцам; дарослым нельга было набліжацца да калоны. Усе немцы былі высокага росту — мелі па 180-200 сантыметраў, крочылі басанож, няголеныя, у парваных мундзірах. Гледзячы на гэтых „звышлюдзей" мяне ахоплівала і здзіўленне, і страх. Камандзір канваіраў тлумачыў, што немцы на тэрыторыі Савецкага Саюза знішчылі многа гарадоў і вёсак і цяпер паедуць іх адбудоўваць. На ляўкоўскім школьным пляцы немцы атрымалі падсілкаванне, а на наступны дзень адвялі іх на чыгуначную станцыю Нараўка, адкуль адправілі ў Савецкі Саюз адбудоўваць знішчэнні. У тым часе савецкія сапёры адбудавалі чыгуначныя пуці і знішчаныя на рэчках Нарва і Нараўка масты.

У час маршу савецкіх пехацінцаў у напрамку Нарвы нямецкая артылерыя вяла агонь, а снарады падалі на сенажаці над рэчкай Нараўкай побач дарогі, якой яны праходзілі; байцы крочылі далей быццам нічога не адбывалася. Праз нейкі час пара штурмавых самалётаў Іл-2 брыючым палётам паляцела ў напрамку, з якога ляцелі снарады; артылерыя змоўкла. Нямецкія салдаты называлі штурмавікі Іл-2 лятучай чорнай смерцю. Самалёты былі памаляваны ў колер хакі, але пасля некалькіх вылетаў выхлапы з рухавікоў перафарбоўвалі іх на чорны колер. Гэтыя самалёты лёталі брыючым палётам на вышыні пяцідзесяці метраў, стралялі з бартавога ружжа, скідалі бомбы, вельмі паспяхова знішчалі танкі, пяхоту і ваенныя аб'екты, таму нямецкія салдаты асацыявалі іх з чорнай смерцю.

У ліпені 1944 года савецкія і польскія войскі вызвалілі ўсходнія землі Польшчы і маршыравалі на захад. На самаходах віднелі лозунгі „На Берлін" і „Смерць нямецкім фашыстам". У палове ліпеня савецкія ўлады аб'явілі мабілізацыю ў армію мужчын ва ўзросце ад дваццаці да пяцідзесяці гадоў. Зборы адбываліся ў Ваўкавыску, дзе абучалі і фарміравалі новыя вайсковыя часці для змагання на фронце. Пасля некалькіх тыдняў савецкае камандаванне загадала звольніць рэкрутаў з-за лініі Керзана. Неўзабаве польскія ўлады аб'явілі мабілізацыю ў польскае войска мужчын народжаных у 1922-23 гадах.

У жніўні 1944 года ў вёсцы Ахрымы з'явіўся атрад АК, які налічваў каля сарака партызан. Гаварылі яны, што рыхтуюцца да трэцяй сусветнай вайны, а вяскоўцы адказвалі, што вайны ўжо маем досыць пасля акупацыйнага кашмару, калі цяжар вайны, якая забрала найбліжэйшых сямейнікаў, трэба было выносіць на ўласных спінах. Найгорш было ў перапынках паміж войнамі, калі не было ніякай улады: паліцыі, солтыса, войта, лесніка. Была „свабода", але не было солі, цукру, мыла, нафты...

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны ветэраны, што змагаліся ў польскім войску на захадзе і ўсходзе, у радах савецкай і амерыканскай армій, спаткаліся каля царквы ў Старым Ляўкове і расказалі пра сваё змаганне з вермахтам і квантунскай арміяй. Два ўраджэнцы Старога Ляўкова — Ян Харкевіч і Пётр Карпюк — служылі ў амерыканскай арміі. Калі амерыканцы занялі вёску, дзе яны былі прымусовымі работнікамі ў баўэра, яны адразу склалі заяўку, каб прыняць іх у войска, бо хочуць расплаціцца за сваю рабскую працу. Пасля гадзіны з'явіўся амерыканскі капітан, які выдатна гаварыў папольску; праз некалькі гадзін іх прынялі. Далі яны прысягу, атрымалі парадны і палявы мундзіры ды зброю. Пасля кароткага абучэння скіравалі іх у палявую кухню ў якасці памочнікаў кухара. Яны сталі пратэставаць, тлумачачы, што яны хочуць змагацца з немцамі на фронце. Аднак капітан адказаў, што яны з'яўляюцца амерыканскімі салдатамі і маюць выконваць тыя задачы, якія перад імі ставіць камандаванне, а служба ў кухні не адрозніваецца ад баёў на перадавой. Наракалі яны сабе, што папаліся ў нерат, але суцяшаліся, што да канца вайны нядоўга і тых некалькі тыдняў вытрываюць. Іх часць перасоўвалася ў напрамку Берліна, а за ёй палявая кухня. Час ад часу было чуваць артылерыйскія выстралы. Пасля некалькіх дзён маршу ў адной мясцовасці паявілася калона нямецкіх салдат; спераду калоны бег афіцэр з белым палотнішчам у руках — такіх калон было вельмі многа. Салдаты вермахта выглядалі задаволенымі, што трапілі ў амерыканскі палон. З іхніх расказаў вынікала, што яны як маглі ўцякалі перад савецкім войскам. Усе ведалі, што ў савецкім палоне атрымаюць яны па дзесяць гадоў працы пры адбудоўванні ваенных знішчэнняў, якіх вермахт дапусціўся ў Савецкім Саюзе. Пасля заканчэння вайны нашы землякі атрымалі ад амерыканскага камандавання пасведчанні, што змагаліся з вермахтам і вяртаюцца на радзіму.

Вярнуліся і салдаты змабілізаваныя ў Першую армію Польскага Войска; з чатырох змабілізаваных вярнуліся два. У іх ліку былі браты Жукоўскія з Новага Ляўкова. Міхал расказваў, што з братам Валодзем беглі побач сябе наступаючы на нямецкія акопы і раптам брат упаў смяротна ранены... Загінуў таксама Лявон Ахрымюк, сын Ануфрыя з Ахрымоў, вярнуўся Грыша Даніловіч з Капітаншчыны.

Вярнуліся і салдаты Савецкай Арміі, што пад камандаваннем маршала Васілеўскага прымалі ўдзел у разгроме квантунскай арміі: дваюрадныя браты Болбаты з Новага Ляўкова і Мікалай Несцярук з Лазовага. Расказвалі, што перамаглі японцаў у два тыдні. Мікалай Несцярук сказаў, што не толькі на фільмах можна пабачыць, як самураі метка кідаюць нажы — у ягонай роце такім чынам загінулі два салдаты; уадзіночку ніхто з роты не выходзіў. Вярнуўся і сын каваля Казлоўскага з Навін, які быў танкістам у брыгадзе генерала Мачка.

З даўняй Белавежы

Віталь ЛУБА

Пётр Байко, ураджэнец Белавежы, гісторыяй сваёй мясцовасці займаецца ўсё сваё дарослае жыццё. Першапачаткова былі гэта допісы і артыкулы, публікаваныя ў шматлікіх часопісах, у тым ліку і ў „Ніве", а пазней сталі з'яўляцца кніжныя выданні. У гэтым годзе выйшла шостая па ліку кніжка Пятра Байко „З даўняй Белавежы"*.

Як адзначае сам аўтар, на працягу трыццаці гадоў даследчыцка-журналісцкай працы апублікаваў ён каля дзвюх тысяч артыкулаў у амаль сямідзесяці перыядычных выданнях. Дайсці да іх сённяшняму чытачу складаная справа, паколькі часта гэта былі лакальныя, рэгіянальныя ці галіновыя выданні. Менавіта з думкай пра звычайнага чытача аўтар зрабіў падборку артыкулаў, якія былі апублікаваны на працягу апошняга дваццацігоддзя пераважна ў лакальных і рэгіянальных выданнях, і змясціў іх пад адной вокладкай. Спецыяльна для кніжкі артыкулы былі выпраўлены і папоўнены новымі інфармацыямі, часта атрымалі новыя загалоўкі і размеркаваны яны ў сямі тэматычных раздзелах.



Кніжку адкрывае ўступны артыкул „Шэсць стагоддзяў аховы Белавежскай пушчы". Даследчыкі ўстанавілі, што першым дакументам аб Белавежскай пушчы з'яўляецца згадка ў „Хроніцы" Яна Длугаша пра паляванне караля Ягайлы ў 1409 г. Таму гэты год лічыцца пачаткам аховы пушчы і ў 2009 годзе адбыліся святкаванні 600-годдзя ўпамінання пушчы ў пісьмовых крыніцах.

У раздзеле „Агульна аб Белавежы" аўтар дае кароткі агляд гісторыі Белавежы, тлумачыць паходжанне яе назвы, апісвае колішніх жыхароў і гісторыю герба мясцовасці, а таксама ўспамінае тых ураджэнцаў Белавежы, якія дабіліся поспехаў у галіне культуры, мастацва і навукі. У іх ліку апынуліся, між іншым, Георгій Валкавыцкі, Алена Анішэўская, Барыс Руско, вядомыя чытачам „Нівы" паэты.

Другі раздзел „Белавежскія госці" змяшчае артыкулы пра знатных наведвальнікаў пушчы, між іншым, пра Жана-Жака Русо, Зыгмунта Глогера, Івана Шышкіна, Элізу Ажэшка, Ляона Вычулкоўскага, Эдварда Герка, прынца Філіпа. У чарговым раздзеле „Здарэнні" зафіксаваны найважнейшыя і найцікавейшыя эпізоды з мінулага Белавежы, пачынаючы з палявання караля Ягайлы, а канчаючы на НЛА ў дзевяностых гадах мінулага стагоддзя. Адзін з артыкулаў гэтага раздзела апісвае гарачы 1922 год, калі ў пушчы дзейнічаў атрад Атамана Скамароха — Германа Шыманюка. Цікавым эпізодам гэтага перыяду было выданне газеты „Беларускі партызан", рэдакцыя якога, як паведамлялася ў паасобных яе нумарах, знаходзілася ў „галоўным штабе беларускіх партызан у Белавежскай пушчы". Газета выходзіла са жніўня да снежня 1922 года.

Чацвёрты раздзел апісвае паляванні каралёў, цароў, прэзідэнтаў, айчынных і замежных палітыкаў, а пяты — установы і арганізацыі: Падставовую школу, Дырэкцыю дзяржаўных лясоў, грамадскія арганізацыі „Сям'я лесніка" і „Вайсковая падрыхтоўка леснікоў", Дзяржаўную школу для леснікоў.

„Месца і аб'екты" — так называецца шосты раздзел, героямі якога з'яўляюцца, між іншым, помнікі белавежскай архітэктуры: драўляны дворык XIX ст., царскі палац, палацовая брама, будынкі г.зв. палацовага ансамбля, а таксама прыроды: трохсотгадовая магіла памерлых ад чумы, урочышча Ганчары, дуб Ягайлы. Завяршае кніжку раздзел „Людзі", у якім аўтар знаёміць чытача з выдатнымі белавежцамі. Галерэю белавежскіх знакамітасцей адкрывае лекарка Вольга Смактуновіч, якая ўсё сваё дарослае жыццё прысвяціла ахове здароўя мясцовага насельніцтва. Аўтар не абышоў маўчаннем белавежскіх мастакоў і паэтаў. Адзін артыкул прысвечаны Георгію Валкавыцкаму — паэту, празаіку і публіцысту, заснавальніку і шматгадоваму рэдактару „Нівы". Аўтар піша таксама пра іншыя асобы, вядомыя ўважлівым нашым чытачам з ранейшых публікацый, напрыклад, пра даваеннага лоўчага Сцяпана Харчуна, егера Яна Патоку ці калекцыянера Рыгора Байко.

Размеркаванне артыкулаў пра падзеі, помнікі, установы, асобы ў тэматычных раздзелах надае кніжцы энцыкладпедычны характар, што дазваляе чытачу лёгка знайсці цікавыя яму артыкулы.

* Piotr Bajko, *Z dawnej Białowieży*, Otwock — Białowieża 2010, ss. 256.

http://belkabinet.by

ВІРТУАЛЬНЫ КАБІНЕТ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Нягледзячы на тое, што навучальных устаноў з беларускай мовай навучання як у Беларусі, так і за яе межамі не надта многа, беларуская мова і літаратура паранейшаму выкладаюцца як асобныя прадметы. А калі яны занесены ў школьную праграму, то, насуперак суцэльнаму заняпаду беларускасці, мусяць быць планы і навукова абгрунтаваныя метады яе выкладання.

Кабінет беларускай мовы і літаратуры цяпер існуе і ў віртуальнай прасторы. Месціцца ён па адрасе **http://belkabinet.by** і выглядае настолькі прывабна, што не адразу ўсведамляеш, што гэта сайт, дзе ходзіць выключна пра школьныя прадметы для настаўнікаў. Уверсе змешчана цудоўная выява нейкага ляснога краявіду з папаратнікам, соснамі і божымі кароўкамі. На ўсё гэта струменіцца сонечнае святло, якое пранікае праз сасновыя галіны.

Сайт падзелены на дзве часткі. З левага боку — выйсці на рубрыкі, апытанне, статыстыка, некалькі спасылак на сайты адукацыйнай тэматыкі, а таксама не зусім звычайнае „воблака тэгаў". З правага боку — прэзентацыя сайта, якую адкрываюць словы з верша Уладзіміра Дубоўкі: „Родная мова, цудоўная мова!/ Ты нашых думак уток і аснова!".

„Дадзены сайт створаны для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, каб яны маглі знайсці на ім патрэбны матэрыял і выкарыстаць яго ў сваёй плённай працы, — тлумачыць непазначаны аўтар сайта сэнс яго стварэння. — Таксама на нашых старонках змешчаны матэрыял і для вучняў, якія цікавяцца беларускай мовай і літаратурай і жадаюць іх вывучаць".

Адразу на галоўнай старонцы, што не зусім звыкла, месціцца акенца для электроннага ліста. Зайшоўшы на сайт інтэрнэт-вандроўнік ці чалавек, які цікавіцца выкладаннем беларускай мовы і літаратуры, можа адразу пакінуць там свае заўвагі і прапановы.

Што ж тычыцца рубрык сайта, то для яго адукацыйнай тэматыкі іх даволі многа. Напрыклад, там змешчана „Нарматыўная база" па выкладанню даных прадметаў на 2010-2011 гады — адукацыйны стандарт па беларускай мове і літаратуры, канцэпцыя вучэбнага прадмета, ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, прыкладнае планаванне.

Старонка „Метадычныя рэкамендацыі" месціць у сабе расповеды пра аналіз і самааналіз урока, арганізацыйныя формы навучання беларускай мове, асноўныя тыпы і віды аналізу ўрокаў беларускай мовы, памятку для пабудовы плана ўрока па мове і літаратуры і іншыя неабходныя настаўніку матэрыялы.

Рубрыка „Метадычны матэрыял" утрымлівае тэкст пра гісторыю беларускага правапісу, навучальны дапаможнік па беларускай мове „Назоўнік", падручнік па беларускай мове „Лічэбнік", а таксама некаторыя іншыя матэрыялы, якія можна спампаваць сабе на камп'ютар.

Карыснай падаецца рубрыка „Бібліятэка", дзе месціцца шмат кніжак, падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па азначаных прадметах. Па ўсім відаць, што аўтар сайта рупліва працуе над ім, папаўняючы віртуальнае кнігасховішча.

Сваю ацэнку сайту даюць карыстальнікі ў „Гасцёўні". „Дзякуй за такі прыгожы сайт. Неабходна папаўняць яго рэсурс. Гэта цудоўна, што ў нас ёсць яшчэ не зусім абыякавыя людзі да роднай мовы!!!" — кажа карыстальнік Vasili.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

Атлеты, што радавалі ў 2010 годзе

2010 год праімчаў імклівым зайцам, што ўцякае ад драпежнай пагоні. Год быў супярэчлівым для беларускага спорту. Пара падвесці яго вынікі, сканцэнтраваўшыся на пазітыўных дасягненнях айчынных атлетаў. У гэтым выпуску прадстаўляем лепшых мужчын, якія радавалі суайчыннікаў на сусветных арэнах, трасах і каналах, стадыёнах і залах. Выбіраць мацнейшых за год было сапраўды няпроста.

1. Аляксей Грышын (фрыстайл) у Ванкуверы (Канада) на зімовых алімпійскіх гульнях дасягнуў вышэйшага поспеху — стаў пераможцам у акрабатычных скачках. Гэта першы залаты медаль на белых алімпіядах у гісторыі Беларусі.

2. Дзяніс Гаража (веславанне) перамог на чэмпіянаце свету і другі год запар стаў мацнейшым на кантыненце ў каноэ на дыстанцыі 500 м. Плюс еўрасрэбра ў камандавым заездзе квартэтаў на „тысячы".

3. Сяргей Новікаў (біятлон) сенсацыйна стаў сярэбраным прызёрам індывідуальнай гонкі на 20 км алімпіяды ў Ванкуверы, паказаўшы лепшы вынік у кар'еры.

4. Сяргей Мартынаў (стральба) другі раз у сваёй біяграфіі стаў чэмпіёнам свету. Ён перамог у практыкаванні лежачы з малакаліберай вінтоўкі (дыстанцыя 50 м), а таксама заваяваў золата ў фінале Кубка свету, прычым паўтарыў абсалютны сусветны рэкорд — 600 ачкоў з 600 магчымых.

5. Раман Петрушэнка і **Вадзім Махнеў** (веславанне) яшчэ раз пацвердзілі свой высокі клас — спярша на чэмпіянаце свету выйгралі золата ў парнай байдарцы на дыстанцыі 500 м, а ў экіпажы занялі другое месца на дыстанцыі 1000 м, а потым на „Еўропе" перамаглі ў байдарцы-двойцы на паўкіламетровай адлегласці.

6. Алег Юрэня (веславанне) стаў новай зоркай беларускага спорту — на яго рахунку першае месца ў байдарцы на дыстанцыі 5000 м, а таксама другі вынік на кіламетровым адрэзку на чэмпіянаце Еўропы і бронзавы медаль першынства свету на 1000 м.

7. Андрэй Міхневіч (штурханне ядра) паказаў, што не старэюць душой і целам ветэраны і здабыў у Барселоне тытул чэмпіёна Еўропы, а таксама ўзяў шэраг прызоў на іншых буйных турнірах.

8. Цімох Дэйнічэнка (грэка-рымская барацьба) стаў другім на чэмпіянаце свету ў вагавай катэгорыі да 96 кг. Такі ж вынік у яго і на еўрапершынстве.

9. Дзмітрый Каспяровіч (спартовая гімнастыка) адзіны з беларусаў здолеў трапіць на п'едэстал на чэмпіянаце свету, заняўшы 3-е месца ў апорным скачку.

10. Андрэй Краўчанка (шматбор'е) у сталіцы Каталоніі на чэмпіянаце Еўропы ў спаборы рыцараў дзесяці якасцей заваяваў пачэсную бронзу.

11. Андрэй і **Аляксандр Багдановічы** (веславанне) сталі сярэбранымі прызёрамі чэмпіянату свету на адрэзку 1000 м на каноэ-двойцы, пацвердзіўшы сваё майстэрства.

Сярод каманд безумоўна варта адзначыць розныя экіпажы весляроў, моладзевую футбольную зборную Беларусі, якая трэці раз у гісторыі выйшла ў фінальную частку чэмпіянату Еўропы, барысаўскі футбольны БАТЭ, які прабіўся ў вясеннюю стадыю Лігі Еўропы. Зборная па настольным тэнісе стала сярэбраным прызёрам чэмпіянату кантынента, аналагічнага поспеху дасягнула дружына па мотаболе, якая чацвёрты раз запар узышла на другую прыступку п'едэстала. Серабро ўзялі на чэмпіянаце Еўропы і батутысты. Парадавалі таксама самбісты, фрыстайлісты, скакуны ў ваду, некаторыя веласіпедысты, баксёры і штангісты. Усе дасягненні ў падсумаванні і не адзначыш, хапала ў 2010 годзе і правалаў, але на гэтым ставім кропку.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Бандзюга

Пётр БАЙКО

Гэтак, вось, жыхары Белавежы называюць адно з урочышчаў на Белавежскай паляне, якое размяшчаецца побач Заставы — даўняй вёскі, а зараз раёна Белавежы. Урочышча цягнецца ад рэчкі Нараўкі і крайніх збудаванняў Заставы да самкнутай сцяны лесу. Займае паверхню каля 39,5 га.

Дыялектная назва ўрочышча выводзіцца ад слова „біндуга", якое абазначае месца, на якім складвалі драўніну, прызначанаю для сплаву. Першую біндугу арганізавалі тут ужо ў перыяд дзейнасці ў Белавежскай пушчы Антона Тызенгаўза (у другой палове XVIII стагоддзя). Паўторна збудавалі яе ў 1930-я гады.

Пасля II сусветнай вайны, калі ўжо спынена сплаў драўніны, Бандзюга ператварылася ў выган, якім карысталіся жыхары Заставы. Яшчэ ў міжваенны перыяд у паўднёвай частцы ўрочышча ўзнікла спартыўная пляцоўка, на якой разыгрываліся футбольныя матчы. Пляцоўкай карысталіся таксама пасля вайны. Зараз пляцоўка ўжо не існуе.

Перад сплавам на рацэ Нараўцы каля Заставы

У 2005-2006 гадах Павятовае староства ў Гайнаўцы правяло падзел грунтаў ва ўрочышчы паміж жыхароў Заставы.

Зараз частку Бандзюгі (правы бок ад дарогі з Белавежы ў Пагарэльцы) займае скансэн рускага драўлянага будаўніцтва Падляшша, які сваім пачаткам сягае жніўня 1978 года. На апошняй частцы ўрочышча апошнімі гадамі назіраецца працэс вяртання лесу на адабраную яму калісьці тэрыторыю.

Уладзімір СІДАРУК

Першая школа

Многія чарамшане гавораць, ды і ў школьнай хроніцы запісана, што пасляваенную школу арганізавалі ў былым нямецкім бараку. А гэта няпраўда. Школу арганізавалі ў будынку Місея Верамюка, непадалёк млына Раеўскага (зараз вуліца Аградовая). Вось што гаворыць пра гэта ягоны сын Рыгор.

— Бацька выходзіў з Дварца (БССР). У гэтай вёсцы было ў яго 27 гектараў зямлі. Пасля таго, як ажаніўся (перад трыццатым годам), у Чаромсе купіў пляц і ў 1937 годзе пачаў будаваць дом. Год пазней будова была закончана. Паколькі не было памяшкання для пастарунка паліцыі, дык камендант папрасіў яго здаць будынак у арэнду. Бацька згадзіўся. Цягам года ў адной палове хаты быў пастарунак паліцыі, а ў другой — жыў камендант. У 1939 г., калі выбухла вайна, на будынку паліцыі лунаў нацыянальны сцяг. Немцы бамбілі кузаўскі мост на чыгунцы, чаромхаўскі вакзал і скінулі дзве бомбы на будынак паліцыі ў Чаромсе. Адна з іх разбурыла тарцовую сцяну з падвалінай. Спатрэбіўся рамонт. Пры саветах бацька не прызнаваўся да маёмасці ў Чаромсе. Баяўся, каб не палічылі яго памешчыкам і не раскулачылі ды забралі маёмасць у Дварцы і Чаромсе. Пасля вайны Ігнацы Возьны са Стэфаніяй Сахацкай сарганізавалі ў нашым будынку школу. У пяцідзесятых гадах, калі школу перавялі ў новазбудаваны барак, змяшчалася ў ім Грамадская рада нарадовая. Затым была лячэбніца ветэрынарыі.

Вось такая гісторыя першага будынка школы ў Чаромсе.

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу Якуба Коласа.

1. газ, злучэнне трох атамаў кіслароду = 22 _ 23 _ 4 _ 64 _;
2. каштоўны камень фіялетавага колеру = 25 _ 45 _ 44 _ 113 _ 114 _ 92 _ 93 _;
3. рана ад уздзеяння высокай тэмпературы = 112 _ 111 _ 60 _ 59 _;
4. дзяржава з Порта-Нова = 71 _ 72 _ 99 _ 100 _ 98 _;
5. пасудзіна дэкаратыўнага прызначэння, напрыклад, для кветак = 31 _ 32 _ 101 _ 102 _;
6. складны паўкруг з пласцінак, якім абмахваюцца ў духату = 119 _ 91 _ 66 _ 76 _;
7. карэйская грашовая адзінка = 33 _ 34 _ 61 _ 48 _;
8. гарадскі пасёлак пры ўпадзенні Друйкі ў Дзвіну = 84 _ 85 _ 86 _ 104 _;
9. жонка Адама = 87 _ 41 _ 42 _;
10. жоўта-зялёная вадкасць з печані = 21 _ 20 _ 89 _ 130 _ 131 _;
11. створаны фантазіяй прадмет жаданняў = 1 _ 116 _ 3 _ 2 _;
12. неглыбокае месца ў вадаёме = 105 _ 106 _ 35 _ 36 _;
13. дыпламатычная дэлегацыя спецыяльнага прызначэння = 19 _ 49 _ 90 _ 88 _ 120 _;
14. неадукаваны чалавек = 124 _ 125 _ 15 _ 65 _ 77 _;
15. сталіца Асірыі = 37 _ 38 _ 79 _ 80 _ 81 _ 110 _ 58 _;
16. сябра відэльца = 43 _ 46 _ 47 _;
17. самка паўліна = 6 _ 7 _ 8 _ 9 _;
18. маладзенькі кандыдат у рыцары = 62 _ 63 _ 10 _;
19. пузырыстая маса на паверхні некаторых вадкасцей = 67 _ 70 _ 69 _ 68 _;
20. пасінелы кровападцёк = 26 _ 27 _ 11 _ 13 _ 14 _;
21. брат дачкі = 57 _ 12 _ 24 _;
22. Анатоль, паэт з Гарошкава = 126 _ 123 _ 30 _;
23. тысяча кілаграмаў = 52 _ 53 _ 50 _ 51 _.
24. між паловай і чвэрцяй = 40 _ 96 _ 97 _ 28 _ 29 _;
25. бойкі, спрытны чалавек = 115 _ 94 _ 95 _ 121 _;
26. культавае збудаванне = 73 _ 122 _ 75 _ 74 _;
27. грашовае выражэнне вартасці тавару = 39 _ 78 _ 83 _ 82 _;
28. тонкая сятчатая тканіна = 108 _ 107 _ 17 _ 18 _;
29. цэнтр нафтаноснай заходнесібірскай вобласці = 117 _ 129 _ 127 _128 _ 103 _ 118 _;
30. гарбата = 55 _ 56 _ 54 _;
31. прэснаводная рыба сямейства карпавых (*Leuciscus idus*) = 16 _ 5 _ 109_.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 47 нумара

Кліч, лорд, мільён, прыпол, шалаш, мох, Чорны, амба, есаул, бінт, рвач, вырай, выпуск, капа, трава.

Рашэнне: **Пад ліхім плашчом часам бывае бравы выпівака.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

2011 год

(22.03. — 20.04.) Усе падзеі трактуй як важны экзамен. Хутка бярыся за працу. Не рэагуй нервова, райся ў аўтарытэтаў. У пачуццях будзь спантанным. Кожнае каханне — асаблівае. Памятай аб адпачынку.

(21.04. — 21.05.) Марс цябе разлянівіць. Пільнуйся, каб справы не ўцяклі з-пад кантролю. Спраўляйся з дробязямі. Можаш узяцца за ўласную ініцыятыву. Рамантычныя пачуцці і знаёмствы. Вельмі дбай аб сваё здароўе і кандыцыю, разумна расходуй энергію.

(22.05. — 22.06.) Марс пабудзіць тваю крэатыўнасць. Мноства задум. Калейдаскоп планаў і прыхамацяў. Многа энергіі. Будзь цярплівым і самаўпэўненым. У каханні добрыя дні. Энергія і энтузіязм, але дэканцэнтраваць цябе будзе несур'ёзнае. Талент да негацыяцый.

(23.06. — 23.07.) Будзь больш адважным і прадпрымальным. На працы больш абавязкаў і важных спраў. Чакае цябе праверка ці заданне, конкурс, змаганне за павышэнне. Не разлічвай на іншых. Адкрыеш сакрэты ці змову. Давярай інтуіцыі. Засяродзься на тым, што табе прынясе карысць. Пераможаш, дзякуючы неканвенцыянальным прыёмам.

(24.07. — 23.08.) Больш энергіі і добрых ідэй, хутка іх ажыццявіш. Ужо на пачатку твая новая ідэя будзе гарантаваць табе поспех і прызнанне важных асоб. Узнагароды, кампліменты. Аптымізм, радасць, нагоды для забаў. Добрыя весткі, нават немалы выйгрыш. Добрыя хвіліны ў пачуццях. Развівай свае зацікаўленні, запішыся на курсы.

(24.08. — 23.09.) Пачуццё бяспекі і задавальнення. Спакойны і творчы год. Дасі рады з абавязкамі, у хаце і ў грамадстве. Ветлівасць. Пагодзіш ворагаў. Інспірацыя — мастацтва, біяграфія адной выдатнай асобы. Удалы рамантычны час. Дай шанц новым знаёмствам. Можаш рызыкнуць і на біржы. Асаблівае шчасце! Цешся і драбязой.

(24.09. — 23.10.) Тармазі сваю энергію, дбай аб здароўе і не правакуй ворагаў. Пільнуй свой язык, зважай на дробныя памылкі. Плёткі, спрэчкі ў пары. Сінглы могуць разлічваць на шчасце ў пошуках пары. Трымайся здалёк ад чужых спраў.

(24.10. — 22.11.) Год вельмі ўдалы і творчы. Здзейсніш свае мары, атрымаеш весткі, якія прынясуць табе аптымізм і радасць жыцця. Справы рушаць у добрым напрамку. Не ўлазь у канфлікты. Даруй віноўнікам, першы працягні руку. Сімпатычныя падзеі ў кампаніі і ў сям'і. Перад адзінокім Скарпіёнам ніхто не ўстаіць!

(23.11. — 22.12.) Твае планы здзейсняцца. Пры недахопе трываласці Марс падкіне табе саюзнікаў і паганятых. Сустрэча з важнай асобай, ад якой будзе падтрымка. Замежныя кантакты. Добрыя хвіліны з людзьмі. Падарожнічай, здабывай досвед.

(23.12. — 20.01.) Шанцы на пераломныя і важныя здарэнні. Малымі крокамі пойдзеш да вялікіх мэт. Высокія ацэнкі тваёй працы. Спрыяльныя моманты. Ворагі пападаюць у ямы, якія капалі. Памятай аб сям'і і блізкіх! Пазбудзься комплексаў.

(21.01. — 19.02.) Запануеш над эмоцыямі, будзеш цярплівы і спакойны. Высвятляй незразумелае і няпэўнае. Будзь асцярожны ў фінансах. Шчасце, ды дакладна чытай паперы ў банках і ўстановах. Згоднасць і адкрытасць у пары. Сінглы маюць нечаканыя магчымасці змен. Хапай кожны шанц ад лёсу!

(20.02. — 21.03.) Многа шчаслівых падзей. Будзеш ведаць чаго хочаш. На працы будзеш патрэбны і важны; будзеш мець падтрымку. Добрыя дні ў пачуццях. Нечаканае знаёмства можа кончыцца вяселлем. Вядзі сябе згодна са сваімі прынцыпамі. Адважна рэалізуй мары і давярай інстынкту.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 14 000 egz.

Цуд маем закладзены ў генах!

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Дзесьці за Бельскам-Падляшскім, каля майго месца ў канцы аўтобуса, залунаў прыемны пах святога ялею для мірапамазання. Ён трываў можа дзве, можа тры секунды, каб уміг развеяцца і знікнуць. Адначасова вывеяла і кіславаты пах выслужаных фатэляў, характэрны публічнаму транспарту, якога не ў змозе заглушыць ніякі дэзадарант. Праз намарожаныя вокны ўліваліся малочна-сонечныя прамені. Для сучаснага чалавека найбольшы выклік — схапіць усе прапановы ў жменю і на час справіцца са сваімі задачамі. Я сама была ў падобным разладзе. Яшчэ у той самы дзень, калі разам з парафіяльным хорам я падалася ў паломніцтва ў Тарэспаль (непадалёк Брэста), вечарам чакала мяне выступленне на бенефісе паэта прафесара Алеся Барскага. На здаровы розум я не павінна вярнуцца на час у Беласток. На дарозе стаяла сто перашкод: коўзкія дарогі, паніка, прагноз мяцеліцы. З другога боку хацелася не абмінуць нагоды, якая здараецца раз у жыцці...

Падляшскія жанчынкі не вераць у цуд, цуд яны маюць закладзены ў генах. Магчыма, ужо тады ў самым пачатку дарогі, дзесьці за Бельскам-Падляшскім, калі з'явіўся згаданы пах боскага міра, хтосьці за мяне вырашыў праблему. Я адразу супакоілася, кінула хвалявацца. І нават з агідай зірнула на маладога кансультанта, які праз мабілку далей круціў свае занудлівыя інтарэсы-бізнесы...

* * *

Тарэспаль, 28 верасня 2010 г. Раніцай, перад выхадам у школу гімназіст Лукаш Паплаўскі прыпыніўся ля святога кутка памаліцца. На іконе Багародзіцы „Скорапаслушніцы" прыкмеціў кроплі расы. Ён далікатна дакрануўся пальцам і панюхаў алеістую вадкасць. Пахнела як царкоўны ялей для мірапамазання. Лукаш чуў пра міратачывыя іконы, напісаныя фарбамі на натуральнай дошцы. Яго „Скорапаслушніца", паводле хімічных правілаў, не павінна была падавацца такім цудам, паколькі яна была звычайнай копіяй, адбітай тэхнікай алеаграфіі, наклеенай на кардон. Ікона трапіла ў іх дом таксама звычайным шляхам. Яе, па спецыяльным жаданні гімназіста, купіў у царкоўнай краме ў Луцку настаяцель Тарэспальскага прыхода Яраслаў Лось. „Скорапаслушніца" — тая, якая хутка прыслухоўваецца да просьбаў, цудадзейная ікона, арыгінал якой знаходзіцца на гары Афон, аказалася неабходнай гімназісту па простай прычыне: каб у малітвах, занесеных перад святымі абразамі, не гаварыць шкодных ды пустых пажаданняў.

Гімназіст не адразу сказаў пра сваё адкрыццё сям'і. Ён згаварыў ранішнюю малітву, з'еў сняданак і пашыбаваў на ўрокі. Бацькі таксама не адразу ўмелі звыкнуцца з цудоўным здарэннем у іхняй кватэры. Спачатку прызвалі на параду вопытнага сваяка. Той зірнуў на ікону і адказаў: „Усё нармальна! Яна ўпацела ад пары. Кіньце свае выдумкі і фантазіі пра цуды". Але гімназіст не знаходзіў спакою, перажываў кожнае крытычнае слова і жэст, выкананыя ў бок іконы. Ды ў іх кватэру сталі зыходзіцца людзі, адпраўляць малебны, шмараваць пахучым алеем хворыя месцы. Многія, як рукой зняло, адчулі палёгку. Вестка пра цуд скалыхнула сонным мястэчкам, прыліпшым да польска-беларускай мяжы: „W Terespolu płacze Matka Boska!", „Znowu cud na Podlasiu!" — грымелі загалоўкі найбольш папулярнай прэсы. Яшчэ больш кішэла на інтэрнэт-старонках, дзе актывізаваліся прыхільнікі і непрыхільнікі паранармальных здарэнняў. Каб пазбегчы атмасферы нездаровай сенсацыі і натоўпаў, Паплаўскія занеслі ікону ў царкву і здалі яе пад апеку настаяцелю. Следам пацягнулі паломнікі. Спачатку акафіст Іконе Багародзіцы „Скорапаслушніцы" служылі раз у тыдзень (у пяць гадзін вечара ў нядзелю), а зараз, з прычыны непрадказальнай колькасці паломнікаў, царква адчынена ад панядзелка да панядзелка.

* * *

11 снежня 2010 г. Беластачанка Вольга, чырвонашчокая старажылка родам з-пад Гайнаўкі, спачатку пазахаплялася сонечным надвор'ем, а пасля патлумачыла чаму апранула доўгі кажух з аўчын. Ёй нязручна было вылучацца адной у простым кажусе пры цэлым элегегантным *беластоку*. Некалькі дзён таму Тарэспаль наведала яе сваячка з Бельска. Каб дастацца ў сярэдзіну царквы да мірапамазання, стаяла дзве гадзіны на марозе і снезе. Да касцей прамерзла. Вольга ўлічыла яе прыгоду і, доўга не думаючы, надзела стары кажух, які забыты гадамі вісеў у шафе.

— А тут *пагода* як пад заказ!

Вольга гаварыла пра мароз і не прадчувала, што яе нямодны кажух дзейнічае на мяне якраз у адваротным напрамку, бо замест „марозіць" ён наклікаў цёплыя ўспаміны пра Тарэспаль. Да гэтай пары, пакуль там не аб'явіўся цуд, мястэчка асацыявалася мне з аглядам царкоўных калядак, дзе побач сябе выступалі гарадскія хары і вясковыя бабулі ў святочных вышываных кажухах з аўчын, дабытыя спецыяльна дзеля каляднага конкурсу з куфраў. Такое было ў мяне ўяўленне пра цэлы Тарэспаль.

Дзякуючы апошняй пілігрымцы, я таксама падагнала сваю адсталасць у сацыялагічным і культурным назіранні з'явы. Ранейшы досвед ніяк не прыставаў да таго, што я пабачыла і пачула ў дарозе. Да гэтай пары мне чамусьці здавалася, што сам паломнік павінен вылучацца прыкладнай актыўнасцю, спяваць са слыху набожныя песні, засяроджвацца на жывой малітве. Нашы арганізатары выйшлі насустрач навінкам і менталітэту сучаснага чалавека. Ад пачатку да канца ад паломнікаў яны патрабавалі аднаго: увагі. Пасля малітвы, якую за ўсіх згаварыў духоўны апякун, арганізатары ўключылі кампакт-дыск з запісам радыёперадачы пра Святую Гару Грабарку.

* * *

Цікавы таксама прызнак сучаснасці ў самім кульце Іконы Божай Маці „Скорапаслушніцы". Справа ў тым, што яе копіі таксама праславіліся шматлікімі цудамі.

Найбольш вядомая копія знаходзіцца ў маскоўскім філіяле манастыра святога Панцеляймона, ля якой паломнікі атрымліваюць дар аздараўлення. Іншая цудадзейная копія ў Іркуцку дзесяць гадоў таму сама аднавілася. У ласках копій ёсць пэўнае суцяшэнне для жанчын. Нам немагчыма памаліцца ля арыгінальнай выявы. Ікона знаходзіцца на грэчаскай гары Афон, па якой забараняецца ступаць жаночаму роду. Гэтая асаблівасць, як і гісторыя цудадзейных здарэнняў, агучана ў паэтычных словах акафіста. Манах Ніл, які з палаючай паходняй праходзіў ля іконы Божай Маці, пачуў словы: „Навошта дыміш на мяне". Ніл пусціў паміж вушы пачутае. За гэта ён быў пакараны слепатой. Браты манахі сталі горача маліцца за аздараўленне неразважнага манаха. Багародзіца выслухала іх малітвы і вярнула зрок. Паколькі аздараўленне адбылося без непатрэбнай адтэрміноўкі ў часе, ікону пачалі клікаць „Скорапаслушніцай" — той, якая хутка прыслухоўваецца да просьбаў.

Здавалася б, немагчыма прыдумаць больш сугучны і патрэбны нашаму спешнаму веку культ. Гэта, зразумела, памылковы погляд. Зараз як ніколі патрэбны спакой душы і развага, каб не накляпаць вакол сябе якой дурноты або чартоўшчыны, якая нараджаецца ад спеху. Пра гэта ведаў нават гімназіст з Тарэспаля.

(працяг будзе)

ISSN 0546-1960